

ЧЫМ КАШТОЎНЫЯ ГІСТОРЫІ СЯМ'І 5

ЗМЯНІЦЬ ПАДЫХОДЫ ДА АДХОДАЎ МС




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

2 ЛІСТАПАДА 2018 г.
ПЯТНІЦА
№ 212 (28828)

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TVПРАГРАМА


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір КУХАРАЎ, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Тарыфы на жыллёва-камунальныя паслугі ў 2019 годзе вырастуць не больш як на $5 у эквіваленце. Сёння гэтая работа практычна завершана. Праект дакумента, які ўстановіць тарыфы на новы год, плануецца падрыхтаваць да сярэдзіны лістапада. Мясцовыя органы ўлады прадставілі планава-разліковыя цэны на ЖКП, гэтая інфармацыя абагульненая Мінжылкамгасам і перададзена ў Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю».*

# 25-ы СТАРТ «ЛІСТАПАДА»

Сёння ў кінатэатры «Масква» адкрыецца 25-ы Мінскі міжнародны кінафестываль «Лістапад», што пройдзе пад слоганам «Пазнаючы белы свет» з прысвячэннем рэжысёру Кіры Муратавай. Госці пройдуць па чырвонай дывановай дарожцы, звернуцца да чвэрці стагоддзя гісторыі кінафоруму і паглядзяць фільм адкрыцця «Халодная вайна» Паўла Паўлікоўскі. Па традыцыі падчас цырымоніі будзе ўручаны прыз Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За захаванне і развіццё традыцый духоўнасці ў кінамастацтве», а ў якасці сімвалічнага старту «Лістапада» на сцэне аб штатыў кінакамеры будзе разбіта талерка. Ганаровымі гасцямі цырымоніі і кінафестывалю стануць актрыса тэатра і кіно Святлана Немаляева і акцёр і рэжысёр з Узбекістана Рустам Сагдулаеў. Ужо заўтра на асноўных пляцоўках пачнуцца паказы конкурсных фільмаў. **З нагоды адкрыцця юбілейнага «Лістапада» Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка накіраваў сваё віншаванне гасцям і ўдзельнікам кінафоруму.**

*«Ужо чвэрць стагоддзя наш кінафорум прадстаўляе аўдыторыі цікавыя, якасныя і глыбокія фільмы, выконваючы высокую асветніцкую місію і захоўваючы прыхільнасць сваім прынцыпам і традыцыям. Склад удзельнікаў фэсту, што расце з году ў год, — нагляднае пацвярджэнне яго аўтарытэту сярод прафесіяналаў і аматараў кінамастацтва.*

*На фестывалі заўсёды пануе атмасфера творчай свабоды, няспыннага духоўнага пошуку і сумленнага спаборніцтва.*

*Перакананы, што сёлетні «Лістапад» парадуе нас шырокай панарамай сучаснага кінематографа, падорыць гучныя прэм'еры і яркія сустрэчы з выдатнымі майстрамі і ўзыходзячымі зоркамі сусветнага экрана, стане сапраўдным святам для тых, хто стварае, глядзіць і любіць кіно»*, — гаворыцца ў віншаванні.



# ПРАЦУЙЦЕ Ў БЯСПЕЦЫ!

Інжынер па ахове працы Магілёўскага завода ліфтавага машынабудавання Ганна ГУСЕВА.

Фота БелТА.

## КОРАТКА

- **На БелАЭС прыступілі да зборкі рэактара першага энергаблока.**
- «Беларуснафта» здабыла 135-мільённую тону нафты ў краіне.



- **Беларускія народныя казкі будуць выдадзены ў Бялградзе на сербскай мове.**
- «Белпошта» пачала прыём заказаў на віншаванне ад Дзеда Мароза.
- **Ваенная драма «Ідзі і глядзі» з залатой калекцыі «Беларусьфільма» ўвайшла ў сотню найлепшых неанглямоўных фільмаў па версіі брытанскай тэлерадыёкампаніі ВВС.**
- Мытнікі Беларусь, Літва і Латвія дамовіліся аб мерах па памяншэнні чэргаў у пунктах пропуску.

Да 75-годдзя вызвалення 1944 2019

# ХРОНІКА ПІКІРУЮЧАГА БАМБАРДЗІРОЎШЧЫКА

## У Клічаўскім раёне пошукавікі падымаюць савецкі самалёт часоў Вялікай Айчыннай вайны

**Мастацкі фільм Навума Бірмана па аднайменнай аповесці Уладзіміра Куніна тут ні пры чым. Хаця гісторыя са збітым падчас вайны савецкім самалётам, які рухнуў у балота Клічаўскага раёна побач з пасёлкам Ганчанскі, магла б легчы ў аснову яшчэ адной не менш захапляльнай мастацкай стужкі. Мясцовы жыхар Аляксандр Заблоцкі ўспамінае, што баявая машына спікіравала за 300 метраў ад бабулінага агарода. Так расказваў яму бацька, якому ў 1943-м было ўсяго 15 гадоў. Зараз варонка зарасла хмызняком, зацягнулася мохам, чарнічнікам і папараццю, вакол яе глухой сцяной стаіць лес. І магчыма, самалёт так бы і кануў у невядомасць, калі б не пошукавікі, якім Заблоцкі расказаў усю гэту гісторыю.**



Пра паходжанне гэтага надпісу раскажа падняты самалёт.


ISSN 1990 - 763X



ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

СЯБРОЎ У НОВЫМ ГОДЗЕ НЕ МЯНЯЮЦЬ!

Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2019 года.

Заставайцеся з намі — будзе цікава!

# МАРШРУТ ПАБУДАВАНЫ: МІНСК — КІШЫНЁЎ

## Беларусі трэба выходзіць на паўмільярдны тавараабарот з Малдовай

**Пра гэта заявіў Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з прэм'ер-міністрам Рэспублікі Малдова Паўлам Філіпам.**

«Вядома, з Малдовай у нас супрацоўніцтва даўняе. Мы ўжо вызначыліся, па многіх напрамках ідзе работа. У нас і тавараабарот прыстойны, але на паўмільярда трэба выходзіць адназначна, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Мы маем такія магчымасці. Трэба дадаваць да традыцыйных напрамкаў нашага супрацоўніцтва тыя, якія адсутнічаюць».

Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка расказаў аб нядаўняй сустрэчы з Прэзідэнтам Украіны Пятром Парашэнкам у Гомелі. На ёй бакі абмеркавалі ў тым ліку і развіццё адносін з Малдовай. «Я атрымаў поўную падтрымку і запэўніванні, што Украіна заўсёды будзе спрыяць нашаму супрацоўніцтву», — адзначыў Прэзідэнт.

Таксама кіраўнік дзяржавы выказаўся з нагоды запуску авіярэйса паміж Кішынёвам і Мінскам: «Гэта новае акно магчымасцяў. Вось ён, дадатковы праект, пра які мы з вамі калісьці дамаўляліся. Нарэшце мы яго пачалі рэалізоўваць».

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што супрацоўніцтва нашых краін грунтуецца не на дабрачыннасці — любыя двухбаковыя кантракты рэнтабельныя, яны выгадныя і Малдове, і Беларусі.

Беларускі лідар адзначыў дапамогу Малдовы з насеннем кукурузы. Сёлета мы атрымалі ндрэнны ўраджай гэтай культуры — паўтара мільёна тон.

Паводле слоў беларускага лідара, Беларусь і Малдова не прад'яўляюць адна адной ніякіх папярэдніх умоў. Ён дадаў, што Беларусь успрымае Малдову такой, якая яна ёсць, разумее выбар асноўных арыенціраў, таксама як і Малдова разумее нашу краіну.

У адказ Павел Філіп сказаў, што, калі бакі кажуць аб супрацоўніцтве, аб дыпламатычных адносінах, простыя людзі глядзяць на гэта як на нейкую фармальную фазу, але на гэты раз народу прадэманстравалі канкрэтныя дзеянні. «Напрыклад, гэты прамы рэйс Кішынёў — Мінск, на якім я прыляцеў, быў адным з першых пасажыраў», — сказаў ён.

Прэм'ер-міністр пагадзіўся з тым, што рэйс будзе загружаны. Яшчэ як прыклад канкрэтных вынікаў супрацоўніцтва ён назваў беларускія тралейбусы, якія ездзяць па вуліцах Кішынёва. Ён запэўніў, што і па іншых праектах справы ідуць добра.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

# НАДЗЕЙНЫ СТРАТЭГІЧНЫ ПАРТНЁР

**Такое меркаванне пра Казахстан выказаў Прэзідэнт падчас сустрэчы са старшынёй Сената Парламента Рэспублікі Казахстан Касымам-Жамартам Такаевым.**

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што няма неабходнасці казаць пра беларуска-казахстанскія адносіны, паколькі гэта адносіны блізкіх дзяржаў. «Мы заўсёды будзем гэтай палітыкі прытрымлівацца. У нас вельмі сяброўскія адносіны з вашым Прэзідэнтам, мы шмат чаму вучымся адзін у аднаго», — адзначыў ён.

Ён ахарактарызаваў адносіны парламентаў дзвюх краін як добрыя, таксама як і адносіны паміж іх кіраўнікамі. Прэзідэнт падзякаваў старшыні Сената за тое, што той знайшоў час прыехаць у Беларусь на сустрэчу Асноўнай групы Мюнхенскай канферэнцыі па бяспецы. «Карысная гэтая канферэнцыя, я нават не чакаў, што ад яе можа быць такая карысць. Відаць пазіцыі розных краін, асабліва якія супрацьстаяць адна адной», — заявіў ён.

Беларускі лідар дадаў, што літаральна праз некалькі дзён яны зноў сустрэнуцца ў Астане на саміце АДКБ, каб абмеркаваць шматлікія пытанні, у тым ліку — рэфармаванне гэтай арганізацыі, узмацненне яе ролі ў міжнародных справах у гэты няпросты час.

Гандлёва-эканамічныя адносіны паміж Беларуссю і Казахстанам кіраўнік дзяржавы назваў вельмі добрымі, рост тавараабароту — пад 40 %, аднак гэта, на яго думку, не тое, што можа быць паміж нашымі краінамі. «У нас няма ніякіх забароненых тэм і насцярожанасці ў дачыненні да вытворчасці і бізнесу, вашых людзей, — адзначыў Прэзідэнт. — Мы прапанавалі, здавалася б, самыя нерэалізавальныя рэчы для Казахстана ў плане стварэння сумеснай вытворчасці на базе «Гомсельмаша», уваходжанне ў капітал вашай краіны. І пастаўкі ўзаемныя — гэта ўжо не пытанне гандлю. Мы больш глыбокія маем адносіны. Мы павінны разумець, што ў гэтым напрамку мы будзем дзейнічаць, калі ў вас будзе на гэта воля».

Словам, беларускі лідар адзначыў, што Беларусь будзе развіваць з Казахстанам самыя цесныя і добрыя адносіны. Ён падкрэсліў: Казахстан — надзейны стратэгічны партнёр для нашай краіны.

У адказ старшыня Сената падзякаваў Прэзідэнту за магчымасць сустрэчы, нават нягледзячы на вельмі шчыльны графік.

Што датычыцца Мюнхенскай канферэнцыі, то старшыня Сената павіншаваў беларускага лідара з бліскучай прамовай. Ён адзначыў, што і іншыя ўдзельнікі мерапрыемства вельмі высокай думкі пра выступленне Прэзідэнта. Касым-Жамарт Такаеў назваў выступленне адкрытым і дзелавым, можна сказаць, шчодрым на вельмі сур'ёзныя сігналы ў адрас міжнароднай — і еўрапейскай у прыватнасці — супольнасці.

* * *

Учора старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Міхаіл Мясніковіч і старшыня Сената Парламента Казахстана Касым-Жамарт Такаеў падпісалі пратакол верхніх палат парламентаў дзвюх краін аб стварэнні падкамісій па развіцці супрацоўніцтва ў інавацыйнай сферы.

«Я лічу, што гэты дакумент — позірк у будучыню, бо традыцыйныя галіны, канешне, развіваюцца, але гэта могуць быць тры-пяць працэнтаў росту ў год, а патрэбны прарыў. Інавацыйны кірунак — гэта навукаёмістыя і ў меншай ступені матэрыялаёмістыя вытворчасці з высокай доляй дабаўленай вартасці дзякуючы інтэлектуальнаму кампаненту», — заявіў журналістам пасля цырымоніі падпісання Міхаіл Мясніковіч.

Напярэдадні ў верхняй палаце беларускага парламента адбыліся перагаворы з казахстанскай парламенцкай дэлегацыяй па шырокім коле двухбаковых адносін — гандлёва-эканамічным, інвестыцыйным, гуманітарным супрацоўніцтве. Старшыня Савета Рэспублікі таксама падзякаваў казахстанскім калегам за ўвагу да этнічных беларусаў, якія пражываюць на тэрыторыі Казахстана. Ён адзначыў, што Савет Рэспублікі ўдзяляе вялікую ўвагу падтрымцы сувязяў з суайчыннікамі за мяжой. «Мы звяртаем на гэта ўвагу і нам неабыякавы стан нашых суайчыннікаў за мяжой. Мы пра іх памятаем і адсочваем пытанні, якія іх хвалююць», — сказаў Міхаіл Мясніковіч.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА, Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

Глабальны кантэкст

Munich Security Conference msc Münchner Sicherheitskonferenz

# ДЫЯЛОГ СУПРАЦЬ КАНФЛІКТУ

## Старшыня Мюнхенскай канферэнцыі па бяспецы запрасіў Прэзідэнта Беларусі на форум у лютым

**Штогод у лютым на Мюнхенскую канферэнцыю па бяспецы (МКБ), каб абмеркаваць надзённыя пытанні, збіраюцца амаль паўтысячы прадстаўнікоў улады і экспертаў з усяго свету. «Я буду вельмі рады прымаць спадара Лукашэнку на Мюнхенскай канферэнцыі па бяспецы, калі ён пажадае ўзяць у ёй удзел у 2019-м або 2020 годзе», — сказаў старшыня МКБ Вольфганг ІШЫНГЕР падчас прэс-канферэнцыі.**

### Канфлікт ва Украіне

Зрабіла ўражанне на спікера зацікаўленасць Прэзідэнта Беларусі ў вырашэнні ўкраінскага канфлікту: «Мяне ўразіла тое стаўленне і імкненне Аляксандра Лукашэнкі як мага хутчэй вырашыць сітуацыю на ўсходзе Украіны, дасягнуць там міру. Я ўпэўнены, што да тых цікавых прапаноў, якія ён вылучыў, уключаючы місію на ўсходзе Украіны, міжнародная супольнасць прыслухаецца». Асабліва адзначыў старшыня МКБ прапанову беларускага лідара выдзеліць свае рэсурсы для ўдзелу ў місіі па гарантаванні міру і бяспекі на ўсходзе Украіны.

### Роля мінскага працэсу

Па словах Ішынгера, мінскі працэс па рэгуляванні сітуацыі ва Украіне сёння, на жаль, не дастаткова эфектыўны: «Але прагрэс адбудзецца, калі будзе палітычная воля з абодвух бакоў. Пашырэнне, змяненне фармату і кола яго ўдзельнікаў зможа дапамагчы, калі будзе палітычная воля. Я глыбока перакананы і неадночы гаварыў і пісаў, што ЗША павінны быць за сталом перагавораў. І Еўрапейскі саюз павінен быць прадстаўлены за ім». З-за выбарчага працэсу ва Украіне чакаць пазітыўных змен у хуткім часе не прыходзіцца, лічыць Ішынгер. Але інавацыйныя прапановы Аляксандра Лукашэнкі, выказаныя на сесіі, могуць напоўніць перагаворы новай энергіяй.

### Перагаворы Сербіі і Косава

Выказаўся старшыня МКБ наконт праблемы Косава і Сербіі: «Гэта няпросты напрамак дзейнасці. Мне, як чалавеку, уключанаму ў працэс абмеркавання па Косаве, зразумела, як складана гэтаму працэсу развівацца. Вельмі важна, каб прадстаўнікі абодвух бакоў звярнуліся да міжнароднай супольнасці з просьбай больш актыўна дапамагаць, каб дасягнуць канчатковага ўрэгулявання канфлікту».

### Дагавор аб РСМД

Вольфганг Ішынгер параіў зацікаўленым бакам не выходзіць з пагаднення аб ракетах сярэдняй і меншай далёкасці і забяспечыць яго поўнае выкананне: «Для нашай планеты ў цэлым адмова ад пэўнага віду ядзернай зброі — гэта неабходны пазітыўны элемент». Аб намеры пакінуць пагадненне заявілі ЗША. Такі крок можа нанесці значны ўрон сістэме рэгіянальнай бяспекі і глабальнай стабільнасці ў свеце.

**Марыя ДАДАЛКА.**

### У тэму

У першы дзень сустрэчы Асноўнай групы МКБ асаблівую ўвагу аддалі перагаворам паміж прадстаўнікамі Сербіі і Косава і дэталёваму абмеркаванню сітуацыі ва Украіне.

У дачыненні да мінскага працэсу ва Украіне прадстаўлены розныя пазіцыі. З аднаго боку — мінскі фармат неабходны, але ўжо недастатковы і трэба знаходзіць іншыя пляцоўкі. З другога — адыход ад выбранай формы выкліча абвастрэнне праблемы.

Падчас дыскусіі былі абазначаныя чатыры асноўныя прычыны канфлікту на Данбасе: геапалітычнае, геаэканамічнае супрацьстаянне двух блокаў, двухбаковыя расійска-ўкраінскія адносіны і канфлікт унутры самога ўкраінскага грамадства. Мінскі працэс, на думку спецыялістаў, працуе толькі над дзвюма апошнімі праблемамі.

Было таксама адзначана, што заходнія партнёры жывуць нарратывамі, якія не маюць нічога агульнага з рэальнай палітыкай Расіі ў адносінах да Украіны. Расійская Федэрацыя, як ніхто іншы, зацікаўлена ў вырашэнні канфлікту: мільёны расіян і ўкраінцаў звязаныя роднаснай сувяззю, Расія нясе страты ад санкцый і прымае бежанцаў з зоны ваенных дзеянняў.

На думку экспертаў, міру на Данбасе можна дасягнуць «развядзеннем сіл, спыненнем агню і дакументальным зацвярджэннем асаблівага статусу гэтага рэгіёна».

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Расія, Іран і Індыя маюць намер стварыць альтэрнатыву Суэцкаму каналу



Расія, Іран і Індыя плануюць перабудаваць лагістыку ў азіяцкім рэгіёне і запусціць новы міжнародны транспартны калідор, які будзе альтэрнатывай Суэцкаму каналу. Пра гэта гаворыцца ў паведамленні індыйскага міністэрства гандлю і прамысловасці.

Новы транспартны калідор працягнецца на 7200 км і злучыць Індыйскі акіян з РФ і Еўропай. У 2014—2017 гадах ужо праводзіліся тэставыя запускі па гэтым маршруце.

Тавары будуць адпраўляцца па моры з Індыі ў іранскі порт Бэндэр-Абас, затым на цягніках будуць дастаўляцца да найбуйнейшага порта Ірана Бэндэр-Энзелі на Каспіі, далей накіруюцца ў Астрахань і па чыгунцы будуць пастаўляцца ў Еўропу.

Адзначаецца, што калідор стане больш танная і караткай альтэрнатывай Суэцкаму каналу: час і кошт грузаперавозак зменшацца на 30—40 %. Так, сярэднія тэрміны пастаўкі грузу ў Маскву з Мумбаі павінны скараціцца прыкладна на 20 дзён.

Плануецца, што ў год па новым маршруце будуць праходзіць 20—30 млн тон тавараў.

### Расія ўвяла контрмеры ў адказ на санкцыі Украіны

Прэм'ер-міністр РФ Дзмітрый Мядзведзеў падпісаў учора распараджэнне аб увядзенні Расіяй санкцый супраць шэрагу ўкраінскіх кампаній і грамадзян, паведаміла прэс-служба расійскага ўрада.

«Уводзяцца спецыяльныя эканамічныя меры ў дачыненні да фізічных і юрыдычных асоб Украіны, якія прадугледжваюць блакіраванне (замарожванне) безнаяўных грашовых сродкаў, бездакументарных каштоўных папер і маёмасці на тэрыторыі Расіі і забарону на пералічэнне сродкаў (вывад капіталу) за межы Расіі. Санкцыі будуць распаўсюджвацца на 322 фізічныя асобы і 68 юрыдычных асоб», — гаворыцца ў паведамленні прэс-службы ўрада РФ.

Пад санкцыі трапілі суддзі Канстытуцыйнага Суда Украіны, дэпутаты Вярхоўнай Рады VIII склікання, буйныя ўкраінскія прадпрымальнікі, чыноўнікі адміністрацыі прэзідэнта Украіны, кіраўнікі органаў выканаўчай улады Украіны і буйных украінскіх кампаній, а таксама юрыдычныя асобы, якія кантралююцца найбуйнейшымі бізнесменамі Украіны.

### Трамп назваў права грамадзянства па нараджэнні вар'яцтвам, якое абыходзіцца ЗША ў мільярды

Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп назваў у сераду права на атрыманне амерыканскага грамадзянства на падставе таго, што чалавек нарадзіўся на тэрыторыі Злучаных Штатаў, «вар'яцкай палітыкай», якая штогод абыходзіцца бюджэту краіны ў мільярды долараў. Прэзідэнт зноў раскрытыкаваў гэтае права, выступаючы перад сваімі прыхільнікамі ў штаце Фларыда.

«Дэмакраты хочуць працягнуць аўтаматычна даваць грамадзянства па нараджэнні кожнаму дзіцяці, якое нарадзілася на тэрыторыі ЗША ў сям'і ў нелегальных імігрантаў, нават калі яны знаходзіліся на нашай зямлі толькі лічаныя секунды. Штогод сотні тысяч дзяцей нелегальных імігрантаў аўтаматычна становяцца грамадзянамі з-за гэтай вар'яцкай палітыкі. Усе яны адразу ж маюць права на атрыманне ўсіх перавагаў і выгод амерыканскага грамадзянства коштам у мільярды долараў для бюджэту краіны штогод», — адзначыў прэзідэнт.

Ён нагадаў, што гэтая палітыка прывяла да стварэння так званага радзільнага турызму — распаўсюджанай практыкі, калі цяжарныя іншаземкі едуць нараджаць у Злучаныя Штаты дзеля атрымання грамадзянства.

Транспарт

# НОВЫЯ САМАЛЁТЫ — НОВЫЯ МАРШРУТЫ

**Авіякампанія «Белавія» разлічвае атрымаць дазвол на ажыццяўленне рэгулярных рэйсаў у Мюнхен у 2019 годзе. Пра гэта паведаміў генеральны дырэктар кампаніі Анатоль ГУСАРАЎ.**

Кіраўнік авіякампаніі адзначыў, што яны плануюць пашыраць сетку маршрутаў: разглядаецца магчымасць адкрыцця да летняга сезона рэйсаў у Мурманск, Талін і па іншых напрамках. Больш актыўна плануецца развіваць палёты з абласных аэрапортаў, гаворка ідзе аб павелічэнні як напрамкаў, так і рэйсаў. Канчатковы план адкрыцця новых маршрутаў на наступны год пакуль не сфарміраваны.

У найбліжэйшыя два гады «Белавія» плануе папоўніць свой авіяпарк пяццю самалётамі Embraer і шасцю Boeing 737 MAX. Кіраўнік авіякампаніі адзначыў, што ў «Белавія» ёсць дакладны план істотнага абнаўлення флоту. «У наступным годзе мы набудзем у лізінг чатыры новыя самалёты Embraer з заводаў-вытворцаў і два самалёты новага пакалення Boeing 737 MAX8», — праінфармаваў Анатоль Гусараў. У 2020 годзе, паводле яго слоў, будзе набыта ў лізінг яшчэ чатыры самалёты Boeing 737 MAX8 і адзін Embraer.

«За тры гады мы абновім практычна палову флоту авіякампаніі», — адзначыў Анатоль Гусараў. Ён нагадаў, што сёлета авіяпарк «Белавія» ўжо папоўнілі тры самалёты Embraer. Гэта дае кампаніі магчымасць больш актыўна праводзіць палітыку па зніжэнні кошту білетаў. «Я ўпэўнены, што ў найбліжэйшы час мы зможам прапанаваць досыць цікавыя прадукты, якія будуць станоўча ацэнены», — падсумаваў дырэктар кампаніі.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Класныя навіны

# СТАТЫСТЫКА ДЛЯ ШКОЛЬНІКАЎ

**Летась самая вялікая колькасць наведвальнікаў была зафіксавана ў музеі Вялікай Айчыннай вайны (565,3 тысячы чалавек). На другім месцы апынуўся Мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой» (425,2 тысячы наведванняў). Далей ідуць Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік «Нясвіж» (417,4 тысячы) і Гомельскі палацава-паркавы комплекс (326,8 тысячы). А замыкае «пяцёрку» замкавы комплекс «Мір».**




У ТОП-3 самых папулярных у Мінску тэатраў увайшлі Нацыянальны акадэмічны тэатр оперы і балета, Беларускі дзяржаўны акадэмічны музычны тэатр і Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы. Гэтыя і многія іншыя цікавыя звесткі ўвайшлі ў зборнік «Вывучаем Беларусь» (статыстыка для школьнікаў), які выйшаў у выдавецтве «Пачатковая школа». Даведачнае выданне падрыхтаванае па заказе Статыстычнага камітэта і ўтрымлівае навейшую афіцыйную статыстычную інфармацыю, адаптаваную для школьнікаў.

— Кампетэнтнасны падыход, які рэалізуецца ў адукацыі, вымагае ўмення ад школьнікаў працаваць з самымі рознымі крыніцамі інфармацыі, а не толькі са звычайнымі тэкстамі, — падкрэслівае **дырэктар выдавецтва «Пачатковая школа» Вольга ВАНІНА.** — Наша кніга ўся складаецца з такога роду інфармацыі: яна ўтрымлівае графікі, табліцы, дыяграмы. Тэматыка, прадстаўленая ў зборніку, надзвычай шырокая. З яго, напрыклад, можна даведацца як пра нейкія важныя эканамічныя паказчыкі, нюансы сямейнага бюджэту, так і пра чакаsuccessanую працягласць жыцця пры нараджэнні, самыя папулярныя імёны хлопчыкаў і дзяўчынак, якія прадукты і ў якой колькасці спажываюцца ў сярэднім на душу насельніцтва, ТОП-10 краін, адкуль прыязджаюць турысты ў Беларусь, пра наяўнасць у насельніцтва легкавых аўтамабіляў па марках аўто, працягласць трамвайных і тралейбусных шляхоў у розных гарадах, наколькі адрозніваецца ўзровень заробкаў мужчын і жанчын у розных сферах, пра дасягненні беларускіх спартсменаў, шкодныя звычкі беларусаў, статыстыку дарожна-транспартных здарэнняў, колькасць загінулых дзяцей, самы небяспечны час сутак на дарогах і многае іншае.

Гэта інфармацыя будзе цікавая і карысная як вучням пачатковай школы, так і старшакласнікам. Прыведзеныя звесткі могуць быць выкарыстаны як дадатковы матэрыял пры падрыхтоўцы да ўрокаў геаграфіі, гісторыі, біялогіі, асноў бяспечнай жыццядзейнасці. Школьнікаў з допытлівым розумам кніга можа падштурхнуць агучыць гіпотэзу, стане ключом для правядзення далейшага даследавання і больш дэталёвага вывучэння пытання.

Сёння даводзіцца канстатаваць мазаічнасць успрымання падрастаючым пакаленнем інфармацыі. З вялізнага яе патоку дзеці выхопліваюць толькі тое, што ім цікава, адзначае Вольга Ваніна. Таму было вельмі важна адабраць і прадставіць інфармацыю ў такім выглядзе, каб не ўзнікала праблем з яе ўспрыманнем.

Размешчаныя ў кнізе лічбы і факты можна будзе скарыстаць пры падрыхтоўцы рэферата, а таксама ў даследчых работах шырокай тэматыкі. Яна адрасуецца навучэнцам і педагогам, а таксама ўсім, хто цікавіцца статыстыкай.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# БЕЛАРУСКІЯ ПІСЬМЕННІКІ — У КІТАЙСКІМ ЧАСОПІСЕ «ЗАХАД»

**У апошнія пяць-шэсць гадоў у Беларусі рэалізаваны цэлы шэраг праектаў па прадстаўленні кітайскай літаратуры на беларускай мове. Найперш — дзякуючы руплівасці Выдавецкага дома «Звязда» і выдавецтва «Мастацкая літаратура», зладжанай рабоце рэдакцый часопісаў «Полымя», «Маладосць», газеты «Літаратура і мастацтва» ў супольнічстве з філалагічным факультэтам і факультэтам міжнародных адносін Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, а таксама Рэспубліканскім інстытутам кітаязнаўства імя Канфуцыя Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.**

І калі пра розныя творчыя праекты, арганізаваныя ў Беларусі, і пісалі ў кітайскім друку, і гаварылі на розных канферэнцыях, прэзентавалі іх на традыцыйным Пекінскім кніжным кірмашы, то новых перакладаў беларускай літаратуры апошнім часам у Кітаі амаль не было. За выключэннем некалькіх новых выданняў кніг лаўрэата Нобелеўскай прэміі Святланы Алексіевіч. Дарэчы, яе першая кніга — «Цынкавыя хлопчыкі» — пабачыла свет у Кітаі ў 1990 годзе. Перакладчык — Гаа Ман. І яшчэ нядаўна вядомы кітайскі паэт Ван Цзянчжао пераклаў падборку вершаў Юліі Алейчанкі. Праўда, некалькі артыкулаў пра беларускую літаратуру і беларускае кнігавыданне з'явілася ў аўтарытэтным кітайскім часопісе «Руская літаратура і мастацтва». Так склалася, што менавіта гэта выданне праяўляе ўвагу да ўсіх нацыянальных літаратур на постсавецкай прасторы.

А днямі з Кітая прыйшло паведамленне ад доктара філалагічных навук спадарыні Чжан Хуэйцінь аб тым, што падрыхтаваны «беларускі выпуск» часопіса «Захад». Гэта — добра вядомае ў Паднябеснай літаратурна-мастацкае перыядычнае выданне. Часопіс выдаецца ў Сіньцзян-Уйгурскім аўтаномным раёне з 1953 года. Пад адной вокладкай да кітайскага чытача прыйдуць вершы народнага паэта Беларусі Рыгора Барадуліна, Віктара Шніпа, Леаніда Дранько-Майсюка, Алеся Бадака, а таксама апавяданні Андрэя Федарэнкі і Алеся Бадака. Перакладчыца паэтычных твораў — Хань Сяае. Апавяданні на кітайскую мову пераклала Чжан Хуэйцінь. Публікацыя здзейсніцца ў першым за 2019 год нумары часопіса «Захад». Кітайскі бок абяцае прэзентаваць выданне на лютаўскай кніжнай выстаўцы-кірмашы ў Мінску.

**Сяргей ШЫЧКО.**

# Дыялог па суботах

**Ва ўсіх рэгіёнах краіны 3 лістапада пройдуць рэгулярныя прамыя тэлефонныя лініі з уладамі. Некаторыя праблемы кіраўнікі вырашаюць не паклаўшы трубку тэлефона, іншыя бяруць пад асабісты кантроль.**

**Традыцыйна тэлефонныя лініі будуць працаваць з 9.00 да 12.00, на званкі адкажуць:**

першы намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Валерый Васілевіч РАБКАВЕЦ. Тэл. 8 016 221 31 21;

старшыня ВІЦЕБСКАГА абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір Уладзіміравіч ЦЯРЭНЦЬЕЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;

старшыня ГОМЕЛЬСКАГА абласнога Савета дэпутатаў Кацярына Анатолеўна ЗЕНКЕВІЧ. Тэл. 8 023 233 12 37;

першы намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Іван Алейзавіч ЖУК. Тэл. 8 015 273 56 44;

кіраўнік спраў МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Рыгор Аляксандравіч ВАРОНІН. Тэл. 8 022 250 18 69;

намеснік старшыні МІНСКАГА аблвыканкама Сяргей Пятровіч НЕЎМЯРЖЫЦКІ. Тэл. 8 017 500 41 60;

старшыня МІНСКАГА гарвыканкама Андрэй Віктаравіч ШОРАЦ. Тэл. 8 017 222 44 44.

Надвор'е

# ЦЯПЛО ПАЦІХУ АДПУСКАЕ

## На наступным тыдні ўначы будзе зноў падмарожваць

**У трэцяй дэкадзе кастрычніка на тэрыторыю краіны паступала анамальна цёплае паветра з паўднёвага захаду Еўропы. А ў апошнія дні месяца ў Брэсцкай вобласці абнавіліся цеплавыя рэкорды, калі тэмпература паветра дасягала плюс 20 градусаў. Лістапад пачынаецца цёплым, але сырым надвор'ем, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Сёння ўдзень на тэрыторыі краіны адаб'ецца ўплыў малаактыўнага франтальнага падзелу, які змяшчаецца з Заходняй Еўропы. Чакаецца пераважна хмарнае надвор'е. Месцамі захаваецца туман. Максімальная тэмпература паветра будзе ад плюс 7 да плюс 13 градусаў, па паўднёвым захадзе – да 14—18 цяпла. У суботу з боку Заходняй Еўропы да нас прыйдуць атмасферныя франты. Яны абумовяць на большай частцы тэрыторыі краіны кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай месцамі чакаецца туман. Тэмпература паветра ўначы складзе 6—12 цяпла, а ўдзень – ад плюс 8 да плюс 14 градусаў.

У нядзелю стане больш сонечна, але пахаладае. А ўсё таму, што тэрыторыя краіны апынецца пад уплывам вобласці павышанага атмасфернага ціску. Будзе пераважна без ападкаў, толькі ўначы франтальны падзел выкліча па паўднёвым усходзе кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай месцамі чакаецца туман. Тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля да плюс 7 градусаў, па паўднёвым усходзе – ад плюс 8 да плюс 9 градусаў. Удзень будзе 6—12 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пачатку наступнага тыдня ўмовы надвор'я на тэрыторыі краіны ў асноўным будзе вызначаць антыцыклон. Стане пераважна без ападкаў. Уначы і раніцай у асобных раёнах чакаецца туман. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 2 градусаў па ўсходзе да плюс 6 градусаў па паўднёвым захадзе краіны, удзень будзе 6—13 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

| Извещение о проведении аукциона | | |
|---|---|---|
| Организатор аукциона | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 | |
| Продавец | ОАО «ТОРГТЕХНИКА», г. Минск, ул. Железнодорожная, д. 31, корп. 1 | |
| **Предмет аукциона. Месторасположение: г. Минск, ул. Веры Хоружей, д. 31, пом. 2н** | | |
| Наименование (назначение) | Общая площадь | Инвентарный номер |
| **Административное помещение** | 119,2 кв. м | 500/D-7094523 |
| Начальная цена с НДС 20 % | **116 160 долларов США** (расчет в белорусских рублях по курсу НБРБ на момент оформления сделки купли-продажи) | |
| Помещение передано по договору аренды. Подробная информация на сайте организатора аукциона cpo.by | | |
| **Задаток 10 %** по курсу НБРБ на дату платежа от начальной цены предмета аукциона перечисляется на счет BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390 | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи: 10** рабочих дней после проведения аукциона | | |
| **Условия оплаты предмета аукциона** | | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи | | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by | | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия | | |
| Дата и время проведения аукциона | **04.12.2018** в 14.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** | |
| Дата и время окончания приема документов | **29.11.2018** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** | |
| Контактные телефоны | **+375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. Email: auction@cpo.by** | |

# ХРОНІКА ПІКІРУЮЧАГА БАМБАРДЗІРОЎШЧЫКА

## Сцэнарый для пакуль што не знятага фільма

Наогул іх было чацвёра — камандзір экіпажа Юрый Кравелец з сяла Палтаўка Омскай вобласці, штурман Уладзімір Нікіфараў з Чаркасаў, што на Кіеўшчыне, паветраны стралок-радыст Аляксей Ганчарэнка з горада Трасцянец Сумскай вобласці і паветраны стралок Павел Перасянчук з сяла Паўлаўка Вінніцкай вобласці. На той момант, калі іх самалёт ІЛ-4 трапіў пад нямецкі прыцэл, усім ім было крыху за 20. З чацвярых выжыў толькі Уладзімір Нікіфараў, ён нават прыязджаў у пасёлак пасля вайны, дзесьці ў пачатку 80-х мінулага стагоддзя.

— Мы сядзелі з бацькам на лаўцы каля дома, калі непадалёк прыпыніўся аранжавы «масквіч», — прыгадвае Аляксандр Заблоцкі. — З машыны выйшаў немалады ўжо, але падцягнуты мужчына. Наблізіўся да нас і звярнуўся да бацькі: «Ну што, Валодзя, не пазнаеш? Гэта ж я — лётчык Нікіфараў». Радасці было, словамі не перадаць.

Менавіта тады, ад Нікіфарава, мясцовыя даведаліся прозвішчы лётчыкаў, якіх яны пахавалі на ўскрайку вёскі. Дагэтуль на помніку было імя толькі аднаго члена экіпажа — Аляксея Ганчарэнкі, як потым высветлілася, радыста. Тады, у 43-м, пры спробе выцягнуць баграмі самалёт з балота ў сельчан атрымалася толькі адарваць некалькі кавалкаў фюзеляжа ды падчапіць кавалак тканіны з дакументам на імя лётчыка.

Штурман наогул выратаваўся цудам. Калі самалёт упаў, немцы кінуліся прачэсваць тэрыторыю. Яны ведалі, што трое лётчыкаў паспрабавалі выратавацца і скочылі з парашутамі. Адзін няўдала прызямліўся і загінуў, другога яны знайшлі і расстралялі, а вось трэці як скрозь зямлю праваліўся. Знайсці яго пашчасціла мясцоваму жыхару — 15-гадоваму Валодзю Заблоцкаму. Падлетак убачыў, што мужчына прытаіўся на дрэве, і паклікаў яго да сябе дамоў. Сям'я, у якой, дарэчы, выхоўвалася сямёра дзяцей, на свой страх і рызыку амаль месяц хавала савецкага лётчыка ад старонніх вачэй.

— Нікіфараў быў вельмі ўдзячны бацьку за тое, што ён, па сутнасці, выратаваў яму жыццё, — кажа Аляксандр Заблоцкі. — Нават люстру падарыў у знак удзячнасці. Бацька яе ўсё жыццё бярог. А лётчык прыязджаў да нас у госці яшчэ некалькі разоў разам з жонкай і сынам, некаторы час ліставаўся з бацькам. А потым сувязь раптоўна абарвалася.

## Сігнал з-пад зямлі

Гісторыя ваеннай даўніны атрымала працяг летась. Пошукавікі правялі візуальны агляд тэрыторыі і зрабілі некалькі цікавых знаходак. Потым «прабілі» інфармацыю па інтэрнэце і ўсё пацвердзілася. Экспедыцыя ў Клічаўскі раён спатрэбілася, каб больш дэталёва вызначыць эпіцэнтр падзення. Дарэчы, летась у тым жа Клічаўскім раёне ўжо паднялі адзін з савецкіх бамбардзіроўшчыкаў. Гэты ляжыць непадалёк, напрасткі кіламетраў за пяць.

...На пошукі самалёта збіралася як на баявое заданне: гумовыя боты, дажджавік (сіноптыкі абяцалі моцныя дажджы), пальчаткі. Ад Магілёва да месца пошукаў прыкладна 70 кіламетраў спачатку па бабруйскай, а потам па клічаўскай трасе. Усю дарогу, пакуль ехалі, толькі і гаварылі, што пра надвор'е. Неба стрымана маўчала, але намякала, што можа заплакаць у любую хвіліну. І мы спяшаемся, каб паспець. Мы — гэта сем байцоў абласнога гісторыка-патрыятычнага пошукавага клуба «Віккру» на чале з яго нязменным кіраўніком Мікалаем Барысенкам, плюс адзін добраахвотнік і я. Мая задача — занатаваць убачанае. Па дарозе заязджаем у сельсавет. Мясцовае кіраўніцтва павінна ведаць, што робіцца на яго тэрыторыі. Перад пачаткам дзеянняў невялічкі інструктаж і роспіс у спецыяльным журнале, што з тэхнікай бяспекі і асаблівасцямі пошукавай работы азнаёмлены.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Кожны з байцоў прафесіянал сваёй справы. Спецыяльнае абсталяванне, добра натрэніраваная інтуіцыя, веданне тэхнічных асаблівасцяў баявых лятальных машын — усё гэта дапамагае даволі хутка і найбольш дакладна вызначыць месца падзення бамбардзіроўшчыка.

Наш самалёт схаваны пад балотнай тванню і нічым сябе не выдае. Байцы старанна прамацваюць глебу. Прыслухоўваюцца, спрабуючы адрозніць, што там унізе — метал або мацярык. Працуюць віккраўцы самааддана, нягледзячы на тое, што холадна, што пад нагамі хлюпае вада. Яўген Бацанаў наогул уваходзіць у такі азарт, што, здаецца, зараз перакапае ўсё балота адзін. Гляджу на гадзіннік: цікава, на колькі ж яго хопіць. Не паверыце, з невялічкімі адпачынкамі капаў дзве гадзіны. І яго таварышы не менш актыўныя. Ад аднаго віду таго, як яны засоўваюць у ледзяную слізкую жыжу рукі па локаць, па скуры бягуць дрыжыкі. Некаторыя працуюць нават без пальчатак. Бо навобмацак хутчэй адчуеш знаходку. У нашым выпадку іх шмат і ў асноўным дробныя. Інжынер-тэхнік Андрэй зноў спрабуе схапіць «сігнал». На гэты раз ён больш магутны і ўпэўнены. А электроншчык Юрый Кармазін між тым заканчвае свае даследаванні. На яго думку, самалёт знаходзіцца на глыбіні не шасці метраў, як меркавалася, а дзесьці трох-чатырох.


Тое, што засталося ад самалёта.

Чым глыбей рыдлёўка ўгрызаецца ў зямлю, тым мацней адчуванні той ужо касмічна далёкай ад нас ваеннай рэчаіснасці. Усё выразнейшым становіцца пах газы, а на паверхні ўсё больш з'яўляецца масляністых плям. Гэта толькі натхняе каманду. Значыць, мы на правільным шляху і не выключана, што знойдзецца той самы член экіпажа, імя якога пакуль афіцыйна значыцца ў спісах зніклых без вестак.

— Самае вялікае задавальненне я атрымліваю, калі знаходжу байца, — дзеліцца падчас адпачынку Яўген Бацанаў. — Сёлета, напрыклад, падчас пошукавай экспедыцыі пад Сідаравічамі пашчасціла натрапіць на чырвонаармейца. Я гэта месца «зачапіў» яшчэ чатыры гады таму. У 1941-м на ўсёй адлегласці ад Магілёва да Быхава былі кропкавыя ўмацаванні нашых байцоў, так яны не давалі магчымасці немцам пераправіцца цераз раку. І гэтае месца было якраз такім умацаваннем. Баец быў пахаваны непадалёк ад дуба. Знайшоўся і яго медальён. Гэта дапамагло адшукаць дачку салдата, якой сёння каля 80. Бачылі б вы, як яна радавалася, казала, што маці ўсё жыццё чакала бацьку з вайны.

## Рэха 43-га

Самалёты — асобная тэма для пошукавікаў. Тут не толькі свае асаблівасці пошуку, але і большая магчымасць высветліць імёны загінулых. Бо нумарныя дэталі самалёта нясуць дадатковую інфармацыю.

— За апошнія два-тры гады я ўдзельнічаў у падняцці трох самалётаў, — удакладняе неўтаймоўны Юрый Кармазін. — Гэта ўсё бамбардзіроўшчыкі, якія ляталі без прыкрыцця. Падымем гэты, а на чарзе яшчэ некалькі.

Пакідаць ваенныя самалёты ў зямлі не толькі супярэчыць нашым уяўленням аб захаванні памяці тых, хто загінуў на вайне, але і элементарным нормам бяспекі. Знаходзяцца ахвотныя да каляровага металу, якія гатовы на ўсё, каб яго здабыць. Дарэчы, па некаторых звестках той самалёт, якім зараз займаюцца пошукавікі, ужо спрабавалі знайсці некаторыя спрытныя грамадзяне. А яны, у адрозненне ад спецыялістаў, капаюць без усялякіх там правілаў тэхнікі бяспекі.

Для гісторыі гэтыя самалёты таксама маюць інтарэс. Вось і цяпер атрымалася знайсці цікавыя рэчы. Кавалкі ад паліўнай апаратуры, малавядомыя дэталі, якія зараз будуць унесены ў банк даных клуба і ў будучыні дапамогуць байцам ідэнтыфікаваць незнаёмы самалёт.

— Гэты бамбардзіроўшчык, дарэчы, з таго ж 17-га гвардзейскага авіяпалка, што і падняты намі летась у Мяжным, — удакладняе Мікалай Барысенка. — Немцы яго збілі 13 кастрычніка, а ў Мяжным — 27 кастрычніка 1943-га. Дарэчы, у гэты дзень на баявое заданне з аэрадрома Адуева Смаленскай вобласці вылецелі сем самалётаў і толькі два з іх вярнуліся. Дзе іншыя, астатнія, невядома. Калі іх збівалі за лініяй фронту і экіпаж цалкам гінуў, месца падзення так і заставалася неўстаноўленым.

На гадзінніку амаль пяць вечара, і неба, якое да апошняй хвіліны трымалася, нарэшце дазволіла праліцца дажджу дробнымі кроплямі. Потым зноў выглянула сонейка. А калі мы ехалі дамоў, збоку ад дарогі, там, далёка за лесам, заззяла рознакаляровая вясёлка. І нехта сказаў: гэта — добры знак.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

### У ТЭМУ

**Мікалай Барысенка, кіраўнік Магілёўскага абласнога гісторыка-патрыятычнага пошукавага клуба «Віккру»:**

— Пошукавая работа вельмі карпатлівая, амаль 90 % інфармацыі перадаецца ад грамадскасці, а мы яе правяраем, ходзім у разведвальныя экспедыцыі. Гэтым акрамя нас займаецца 52-і асобны спецыялізаваны пошукавы батальён, але зараз там засталося ўсяго 80 чалавек.

Нашаму абласному фарміраванню ўжо 25 гадоў, і такіх, як яно, у Беларусі больш няма. У нас амаль у кожным раёне ёсць свае атрады. І працуем мы легальна, з дазволамі на ўсіх узроўнях.


**ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению КЖРЭУП «Сельмашевское» (продавец) извещает о проведении 19 ноября 2018 года открытого повторного аукциона со снижением начальной стоимости по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20**

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, без учета НДС, бел. руб. | Сумма задатка, без учета НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| ПРИМЕЧАНИЕ: **стоимость имущества реализуется без учета НДС (в соответствии с п.п. 2.3 ст. 93 НК РБ).** Местонахождение имущества: **г. Гомель, пр-т Космонавтов, 15** | | | |
| 1 | **Автомобиль специальный техпомощь (фургон) – марки ГАЗ-52-3201,** 1986 г. в., **рег. № 2063 ГСМ**, цвет – голубой, тип ТС – грузовой фургон, инв. № 104053, состояние – требует ремонта | 622,75 | 62,28 |
| 2 | **Автомобиль МАЗ 5551, 1992 г. в., рег. № ЕС 2561**, инв. № 5025, цвет – серо-белый, тип ТС – грузовой, состояние – требует ремонта | 3 427,12 | 342,71 |

**Продавец:** КЖРЭУП «Сельмашевское», г. Гомель, пр-т Космонавтов, 15. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.:** 8 (0232) 22-47-07 – Науменко Николай Владимирович. **Шаг аукционных торгов – 5 %. Для участия в аукционе необходимо: 1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (КЖРЭУП «Сельмашевское»):** р/с BY21 PJCB 3012 4045 4310 0000 0933 в ОАО «Приорбанк» ЦБУ № 400, УНН 400052171, БИК PJCBBY2X, ОКПО 00642495, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 2 ноября 2018 г**. по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 15 ноября 2018 г. в 16.00. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Подача документов по почте не допускается. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до его проведения.** В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти)** рабочих дней со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) рабочих дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). **Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 30.05.2018 г. Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы». Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62**



Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

**Извещение о проведении повторного аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «МЭТЗ им. В. И. КОЗЛОВА», г. Минск, ул. Уральская, д. 4, каб. 502 |

**Предмет аукциона**

**Лот № 1**

**База отдыха Молоди** в составе: **корпус № 1 базы отдыха** (945,6 кв. м, 601/С-26310, составные части: пешех. дорожки 283 кв. м, площадки 1138 кв. м, внутриплощад. дороги и проезды 1347 кв. м, подпорная стенка 108 м и цветник), **корпус № 2 базы отдыха** (902 кв. м, 601/С-26315), **склад для хранения материалов** (28,8 кв. м, 601/С-26317), **склад** (152,3 кв. м, 601/С-24453), **сеть водопровода** (1082,74 м, 601/С-29058), **сети канализации с септиком** (960,62 м, 601/С-29057), **кабельная линия КЛ-0,4 кВ** (916,4 м, 601/С-27840, составные части: опора), иное имущество (можно ознакомиться на сайте организатора аукциона www.cpo.by). Адрес – **Минская обл., Логойский р-н, Швабский с/с, 21** (район д. Молоди)

**Сведения о земельном участке**: пл. **3,4989 га** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания зданий и сооружений базы отдыха

**Начальная цена лота № 1 с НДС – 614 061,96 бел. руб.**
(снижена на 20 %)

**Лот № 2**

**Подсобное сельское хозяйство Молоди** в составе: **бригадный дом** (142,2 кв. м, 601/С-24768, составные части: беседка, дороги 3471 кв. м, 2 площадки 78 кв. м, пож. водоем 5609 кв. м, **закрытая стоянка для сельхозтехники** (926,6 кв. м, 601/С-25747, составные части: площадки 412кв. м), **открытый навес для сельхозмашин** (367,4 кв. м, 601/С-25774), **здание коровника** (2000,1 кв. м, 601/С-25791), **здание склада** (158,5 кв. м, 601/С-25779), **склад для хранения материалов** (23,3 кв. м, 601/С-25777), **зернохранилище** (403,3 кв. м, 601/С-25744), **навес для хранения подстилающего материала** (51,4 кв. м, 601/С-25776), **траншея для хранения навоза** (601/С-25771), **навес над дезбарьером** (40,6 кв. м, 601/С-25778), **пункт технического обслуживания** (112,1 кв. м, 601/С-25775), **ТП** (100,4 кв. м, 601/С-25790), **АЗС** (601/С-25787, составные части: топливораздаточная колонка, резервуар, 3 емкости, будка КУНГ м/к, 2 молниеотвода, ограждение склада ГСМ), **водонапорная башня, артезианская скважина со зданием** (601/С-25772), **сети канализации** (730 м, 601/С-27775, составные части: колодцы, поля фильтрации), **сеть водопровода** (701 м, 601/С-27776, иное имущество (можно ознакомиться на сайте организатора аукциона www.cpo.by). Адрес – **Минская обл., Логойский р-н, Швабский с/с, 22** (район д. Молоди)

**Обременения:** частичная аренда 3-го этажа в бригадном доме

**Сведения о земельном участке**: пл. **47,8847 га** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для организации ПСХ. Ограничения (обременения) прав: охранная зона линий электропередачи напряжением свыше 1000 вольт, пл. 3,5100 га

**Начальная цена с НДС – 1 052 633,69 бел. руб.**
(снижена на 20 %)

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с №BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
Вырашыць праблему дапаможа ўключэнне парадку абыходжання з адходамі, якія ўтвараюцца ў садаводчых таварыствах, гаражных кааператывах, а таксама іншых спажывецкіх кааператывах у схемы абыходжання з камунальнымі адходамі, якія распрацоўваюцца і зацвярджаюцца мясцовымі органамі ўлады, упэўнены ў Мінпрыроды.

Законапраектам таксама прадугледжаны нормы, накіраваныя на спрашчэнне патрабаванняў для суб'ектаў гаспадарання ў галіне абыходжання з адходамі: парадак афармлення дакументаў пры перавозцы адходаў вытворчасці, акрамя небяспечных; індывідуальныя прадпрымальнікі і мікраарганізацыі змогуць не прызначаць службовых асоб, адказных за абыходжанне з адходамі.

— Прыняцце згаданага законапраекта не прывядзе да павелічэння адміністрацыйных працэдур і не пацягне дадатковых расходаў бюджэтных сродкаў, а будзе садзейнічаць аднастайнаму прымяненню заканадаўчых нормаў у вобласці абыходжання з адходамі, забяспечыўшы пры гэтым сістэмнае прававое рэгуляванне пытанняў у гэтай вобласці, — падкрэсліў **міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй ХУДЫК** на пленарным пасяджэнні Палаты прадстаўнікоў.

**Вераніка КОЛАСАВА.**

ДЗЕНЬ САВЕТА

# З РАЗГЛЯДАМ НА МЕСЦЫ...


chausynews.by

**Раённы выязны Дзень Савета прайшоў на базе Антонаўскага сельсавета. Яго ўдзельнікі пабывалі ў некалькіх населеных пунктах, на сацыяльных аб'ектах, азнаёміліся з работай па ўключэнні зямель, якія не выкарыстоўваюцца насельніцтвам, у сельскагаспадарчы абарот. У рамках семінара кіраўніцтва раёна сустрэлася з насельніцтвам, а таксама ўдзельнікі Дня Савета прысутнічалі на мітынгу ў аграгарадку Дужаўка, прысвечаным 75-годдзю вызвалення гэтай тэрыторыі раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, прынялі ўдзел у пасадцы яблыневага саду ў памяць пра падзеі восені 1943 года. Аб гэтым паведамляе Чавуская раённая газета «Іскра».**

У цэнтры ўвагі ўдзельнікаў знаходзіліся пытанні работы грамадскага пункта аховы парадку і грамадскіх фарміраванняў па прафілактыцы правапарушэнняў, п'янства і сямейна-бытавых злачынстваў, разглядаліся і перспектывы развіцця фізкультуры, спорту і турызму на тэрыторыі Антонаўскага сельсавета.

Старшыня мясцовага сельвыканкама Дзмітрый Ільін паведаміў, што сёлета правялі 12 пасяджэнняў Савета грамадскага пункта аховы правапарадку, тры з якіх — у межах сельскіх сходаў. Па выніках работы гэтых саветаў працаўладкавалі шэсць чалавек, пяцёра прайшлі курс лячэння ад алкагольнай залежнасці, траіх рэкамендавалі накіраваць у ЛПП.

Ён расказаў таксама пра работу з абавязанымі, якія згодна з Дэкрэтам № 18 павінны кампенсаваць выдаткі на ўтрыманне дзяцей, што знаходзяцца на дзяржзабеспячэнні, з грамадзянамі, якія злоўжываюць спіртным, сем'ямі, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы. Дарэчы, злачынствы і правапарушэнні жыхарамі сельсавета здзяйсняюцца ў пераважнай большасці выпадкаў падшафэ, таму галоўная задача — узмацніць работу па прафілактыцы злачынстваў і правапарушэнняў, п'янства і алкагалізму.

Між іншым, насельніцтва сельсавета актыўна далучаецца да занятkаў фізкультурай і спортам.

У вольны час, па вечарах і выхадных, моладзь актыўна гуляе ў валейбол, футбол і настольны тэніс, наведвае трэнажорную залу, а летам займаецца на адкрытых спортпляцоўках. Сельскія жыхары прыцягваюцца да ўдзелу ў раённых спартыўна-масавых мерапрыемствах, якія праводзяцца на працягу года.

З выездам на месца адбылася сустрэча з жыхарамі і старастам вёскі Галочава, якія скарысталіся магчымасцю задаць шэраг пытанняў старшыні райвыканкама Сяргею Драздоўскаму і старшыні раённага Савета дэпутатаў Анатолю Мацюліну па праблемах жыццезабеспячэння насельніцтва. У аграгарадку Антонаўка кіраўніцтва раёна азнаёмілася з асартыментам прадукцыі магазіна Чавускага райспажывтаварыства, умовамі знаходжання малых у дзіцячым садку і работай сельвыканкама.

У аграгарадку Дужаўка пасля ўдзелу ў мітынгу і закладцы яблыневага саду разам з вучнямі і педагогамі вучэбна-вытворчага камбіната, а таксама мясцовымі жыхарамі ўдзельнікі мерапрыемства азнаёміліся з работай ФАПа, бібліятэкі, клуба, дзе і адбылося падвядзенне вынікаў. Кіраўнікам і прадстаўнікам раённых службаў было ўказана на недахопы ў рабоце па падрыхтоўцы Дня Савета, вызначаны тэрміны для іх ліквідацыі, таксама быў дадзены шэраг даручэнняў па выніках наведвання сацыяльных аб'ектаў.

# Смеццевыя «войны»



Вольга АНУФРЫЕВА, рэдактар «МС»:

— На днях была непрыемна ўражана адным фактам: у сталічным пад'ездзе дзяўчынка пацярпела ад... пацука. Так-так, звычайнага шэрага, што вызывае агіду толькі адным выглядам. Вось гэтая зусім непрыемная істота ўкусіла дзіця. Каментарый адказнай асобы ад камунальнай службы гучаў выразна: трэба заварваць смеццеправод, каб раз і назаўсёды пазбавіцца ад пацукоў і не дзяліць з імі жыллёвую плошчу, бо чарговая дэратызацыя (папросту: раскіданне атруты ад грызуноў) канчаткова праблему не вырашыць...

Аднак падчас абмеркавання гэтай тэмы сутыкнулася з іншымі поглядамі: маўляў, пацук мог трапіць не толькі са смеццеправода, а адкуль заўгодна, хоць бы з водаправода ці вентыляцыйнага люка. Навошта адразу радыкальныя падыходы па заварванні? Знайшлі камунальнікі падставу, вось і карыстаюцца момантам.

Між іншым, наўрад ці так лічаць бацькі пацярпелага дзіцяці, якія першыя будуць агітаваць суседзяў за тое, каб пагадзіліся даць згоду на заварванне «хатняга сметніка». Нагадаем, што мінімальны парог для прыняцця выніковага рашэння належыць 51 % жыхароў.

І вось на мяжы сумнеўнага камфорту ад магчымасці выйсці на памыйніцу ў хатніх тапках (ці ўласнай ляноты?) і чысціні ў пад'ездзе ўзнікаюць так званыя смеццевыя войны. Напрыклад, у Гродне іх яшчэ добра памятаюць, бо працэс па заварванні смеццеправодаў скончыўся ў гэтым горадзе зусім нядаўна. Самы пік спрэчак прыпаў на перыяд, калі гарадской камунальнай гаспадаркай кіраваў цяперашні намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй Хмель, які, нягледзячы на абставіны і час, заўсёды асабіста ехаў на месца «лакальнага канфлікту» і пераконваў людзей у неабходнасці з'яўлення кантэйнерных пляцовак і тлумачыў плюсы экалагічнага складніка гэтай справы.

Асабіста для мяне ніколі не выклікала вялікай складанасці вынесці з хаты і выкінуць у ацынкаваны кантэйнер пакунак са смеццем ці па дарозе ў прадуктовую краму, ці падчас выгулу сабакі, ці спяшаючыся на працу. Сапраўды, не цяжка, але трэба прызвычаіцца і адмовіцца ад ранейшай звычкі. Бадай, што шкоднай. Ад яе дзякуючы адкрытай інфармацыйнай пазіцыі камунальнікаў адмовіліся ўжо ўсе гродзенцы і наўрад ці ўспамінаюць цяпер, што выклікала ў іх такую хвалю абурэння.

Як не памятаюць і гамяльчане, якія ўжо дзесяцігоддзямі не карыстаюцца смеццеправодамі, — менавіта Гомель стаў першым горадам у краіне, дзе гэты працэс быў запушчаны. «Чвэрць стагоддзя без пацукоў і прусакоў» — пад такім красамоўным загалоўкам чытач сённяшняга нумара «МС» зможа пазнаёміцца з цікавым вопытам гэтага рэгіёна. У матэрыяле «Пазбавіцца ад непатрэбных рэчаў, або Як папоўніць сямейны бюджэт» — даведаецца аб арганізацыі раздзельнага збору смецця ў Салігорску, а аб тым, як прыватнік вырашае экалагічную праблему цэлага раёна — у артыкуле «Цяплічную плёнку — на гранулы».

Цяпер настае час жыхароў сталіцы вырашаць, жыць з памыйніцай побач са сваімі «квадратамі» ці не. Таму нашы карэспандэнты падрыхтавалі шмат карыснай інфармацыі, каб пытанне «заварваць ці не смеццеправод?» не выклікала абурэння ў тых, каму яшчэ трэба на яго адказаць, і не правакавала супрацьстаяння паміж тымі, хто за і хто супраць...

КАМУНАЛЬНЫЯ СТАСУНКІ

# ВЫКІДВАЦЬ ЦЫВІЛІЗАВАНА

## Адходы павінныператварацца ў рэчы, а не ляжаць на палігонах

**Смеццеправоды цалкам знікнуць з беларускіх дамоў у 2020 годзе, а колькасць смеццевых кантэйнераў у краіне ўзрасце да 150 тысяч. Мяркуецца, што гэта і новыя кірункі перапрацоўкі смецця павялічаць аб'ёмы раздзельнага збору адходаў у краіне настолькі, што ў 2020-м мы зможам перапрацоўваць чвэрць створанага смецця, а яшчэ праз 15 гадоў — ужо палову.**




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

### Кантэйнеры пластыкавыя, ацынкаваныя, падземныя

Альтэрнатыва смеццеправодам — кантэйнерныя пляцоўкі са сметніцамі для збору камунальных адходаў і другаснай сыравіны: паперы, шкла і пластыку. А таксама падземныя кантэйнеры для змешаных адходаў. Адна такая ёмістасць замяняе пяць звычайных, выглядае больш эстэтычна, і вывозіць смецце з іх трэба радзей. Галоўнае — знайсці месца, дзе іх можна ўстанавіць з разлікам, што гэта стацыянарная сметніца, змяніць месцазнаходжанне якой будзе ўжо немагчыма.

Больш як 100 падземных кантэйнераў устаноўлена ў Пінску, 70 — у Магілёве, 47 — у Наваполацку. Сёлета 80 такіх прылад будзе закуплена для Магілёва, 30 — для Салігорска, і яшчэ 38 — для Пінска.

— У нормах на добраўпарадкаванне жылых дамоў дагэтуль не прадугледжаны раздзелы, якія датычацца патрабаванняў да збору камунальных адходаў. А ў шчыльнай забудове цяжка знайсці месца для пляцовак, — расказала **Ніна КУЛЬБЕДА, галоўны спецыяліст па інфармацыйнай рабоце Аператара другасных матэрыяльных рэсурсаў.**

Санітарныя нормы прадугледжваюць размяшчэнне кантэйнерных пляцовак не бліжэй за 20 метраў ад вокнаў дома. Аднак ва ўмовах шчыльнай забудовы гэтую лічбу можна паменшаць да 15 метраў, што адпавядае еўрапейскай практыцы. Праўда, у такім выпадку неабходна агарадзіць пляцоўку і, па магчымасці, зрабіць страху і дзверы. Максімальна дапушчальная адцаленасць кантэйнераў ад жылля нормамі ўвогуле не вызначаецца, у савецкія часы яна складала сто метраў, пракаментавала **Марына ТОЎСЦІК, начальнік упраўлення камунальнай гаспадаркі і энергетыкі Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Беларусі.**

Для паўнавартаснага раздзельнага збору другасных матэрыяльных рэсурсаў (ДМР) — шкла, паперы і пластыку — краіне патрэбна каля 150 тысяч кантэйнераў. Цяпер іх у Беларусі каля 84 тысяч. Пры гэтым шмат сметніц — старыя металічныя ёмістасці па 0,75 м³, якія не маюць колаў і накрыўкі. Так што для зручнага збору ДМР яны таксама будуць заменены сучаснымі пластыкавымі або ацынкаванымі сметніцамі з коламі, накрыўкамі і адтулінамі для сыравіны. Летась у Беларусі з'явілася 9000 новых кантэйнераў, а ў сталіцы сёлета набылі каля 700 новых каляровых пластыкавых кантэйнераў.

— Знешні выгляд адтуліны крыху зменіць кантэйнер для адходаў пластыку, бо людзі прывыклі збіраць смецце ў пакет і ім прыходзілася перад сметніцай на адной бутэльцы вымаць і выкідваць у круглую шчыліну. Цяпер кантэйнеры пад пластык будуць мець і круглую, і прамавугольную адтуліны, куды можна будзе і невялікі пакет пакласці, — падзялілася Ніна Кульбеда.

*Даследаванні і апытанні, праведзеныя Цэнтрам экалагічных рашэнняў і аператарам другасных матэрыяльных рэсурсаў, паказваюць: каля 30 % насельніцтва краіны разумеюць неабходнасць сартавання смецця і робяць гэта, а трэць з іх увогуле імкнуцца ствараць менш адходаў. Прыкладна 20 % людзей ніколі не будуць займацца гэтым, нават калі ім заплацяць. Астатняя частка насельніцтва (каля 40—50 %) будзе рабіць неабходнае, калі ствараць ім прыдатныя ўмовы.*

### Пашыраная адказнасць і залогавая сістэма

Цяпер у краіне каля 1600 месцаў, дзе можна здаць ДМР і атрымаць за іх грошы. Асобна арганізаваны таксама пункты збору небяспечных рэчаў: лямпачак і батарэек. Пакрысе мадэрнізуюцца і будуюцца лініі сарціроўкі і дасарціроўкі асобна сабраных адходаў.

— Каб максімальна эфектыўна збіраць для перапрацоўкі той аб'ём упакоўкі, які з'яўляецца ў адходах, у 2020 годзе ў краіне запрацуе дэпазітна-залогавая сістэма збору, — удакладніла прадстаўніца аператара. — Гэта дазволіць збіраць больш як 70 % ПЭТ-бутэлек, шкляной тары і алюмініевых бляшанак. Цяпер на перапрацоўку трапляе, напрыклад, толькі каля 30 % пластыкавай тары. Практыка паказвае, што ў краінах, дзе ўкаранілі такую залогавую сістэму, праз год дасягнулі вяртання ў абарот 70 % бутэлек.

З 2012 года ў Беларусі дзейнічае прынцып пашыранай адказнасці вытворцаў у практыцы абарачэння з цвёрдымі камунальнымі адходамі (ЦКА). Вытворцы і імпарцёры асобных тавараў і пэўных відаў упакоўкі фінансава адказваюць за тое, каб адходы максімальна прыцягваліся да абароту.

— Яны могуць самі збіраць адходы і перадаваць іх на выкарыстанне ці абясшкоджванне. Аднак такіх мала. Большасць выконвае свой абавязак, пералічваючы аператару грошы, якія ідуць на развіццё ў краіне збору другасных рэсурсаў і перапрацоўку адходаў. На гэтыя ж сродкі ў краіне таксама стымулюецца збор ДМР з бытавых адходаў, — расказала Ніна Кульбеда.

Летась 17 % камунальных адходаў у Беларусі адправілі на перапрацоўку — гэта 650 тысяч тон ДМР. За дзевяць месяцаў сёлета сабралі ўжо 520 тысяч тон. Амаль удвая павялічыўся збор адходаў электроннага і электрычнага абсталявання — 8,28 тысячы тон.

### Праектаваць нельга пазбавіцца

У межах Канцэпцыі абыходжання з ЦКА на перыяд 2014—2020 гадоў, зацверджанай Мінжылкамгасам, аблвыканкамы абавязаны паэтапна закрываць смеццеправоды ў існуючай забудоўлі і паралельна тлумачыць грамадзянам, чаму гэта робіцца, зазначыла Марына Тоўсцік:

— У Гомелі і Гродне ўжо заварваны ўсе смеццеправоды, і гарады аснашчаны кантэйнернымі пляцоўкамі. У Гродне іх 380, і горад ад гэтага толькі выйграў. Тут прадугледжаны месцы для буйнагабарытных адходаў, спецыяльныя ёмістасці для будаўнічага смецця. Была, напрыклад, скарга, што пляцоўка закрыла агляд выезду з двара аўтамабілю. Улады вырашылі праблему, устанавіўшы вялікае панарамнае люстэрка, якое дапамагло кіроўцам.

Яшчэ ў 4000 беларускіх дамоў смеццеправоды пакуль функцыянуюць, 2,5 тысячы з іх у сталіцы. Згодна з графікам закрыцця смеццеправодаў на 2018—2020 гады сёлета запланавана пазбавіць ад смеццевага абсталявання яшчэ 1100 шматпавярховікаў, 430 з іх — у Мінску. Мяркуецца, што ў 2020-м смеццеправоды знікнуць зусім.

Пазіцыя Міністэрства ЖКГ адносна наяўнасці смеццеправода ў новым жыллі, якое толькі праектуецца, адназначная — такога абсталявання быць не павінна. І сёлета, здаецца, меркаванне спецыялістаў пачулі. Міністэрству архітэктуры і будаўніцтва Беларусі даручана забяспечыць выключэнне арганізацыі смеццеправодаў пры праектаванні шматкватэрных дамоў, акрамя выпадкаў, калі ў гэтых будынках жывуць людзі з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі.

Мінжылкамгас хадайнічае таксама і пра тое, каб тэхнічныя ўмовы на ўладкаванне кантэйнерных пляцовак арганізацыям-забудоўшчыкам выдавалі жыллёва-камунальныя службы.

### РДФ-паліва і кампаставанне

У Беларусі развіваюцца таксама новыя кірункі абыходжання са смеццем. Плануецца ўкараніць тэхналогіі выкарыстання арганічных раслінных адходаў шляхам кампаставання. Перш за ўсё, гэта адходы з гарадоў: галіны, абрэзкі дрэў, трава, лістота. Шляхам адкрытага кампаставання ў буртах будуць атрымліваць грунт і выкарыстоўваць яго як тэхналагічны для перасыпкі адходаў на палігонах і як урадлівы — для рэкультывацыі кар'ераў.

Налета ў кожным абласным цэнтры і гарадах, якія ім падпарадкоўваюцца, павінны стварыць пляцоўкі для кампаставання.

— Вытворчасць РДФ-паліва з адходаў на смеццеперапрацоўчых заводах — яшчэ адзін кірунак абыходжання з адходамі. Такое рэчыва можна атрымаць з каларыйных фракцый смецця, напрыклад з адходаў пластыку, якія немагчыма выкарыстаць паўторна як сыравіну для вырабу рэчаў, а таксама гумы, кампазітных матэрыялаў, з той жа упакоўкі, якая складаецца з некалькіх слаёў, — падзялілася Ніна Кульбеда. — Такое паліва будзе выкарыстоўвацца на цэментных заводах.

Многія не разумеюць, што адходы — гэта наша агульная праблема, і задача чалавека не толькі ў тым, каб вынесці смецце з кватэры. Узровень спажывання ўзрастае, як і колькасць адходаў. Каб цывілізавана пазбаўляцца ад іх, трэба прыкладаць намаганні, інакш ніяк, упэўнена спецыяліст.

**Ірына СІДАРОК.**

## Тэлесеткі

# МАЗАІКА ТАЛЕНТАЎ

**Трэці сезон рэспубліканскага творчага тэлеконкурсу «Талент краіны» бярэ старт у эфіры канала АНТ 3 лістапада.**

Кожную суботу цягам двух месяцаў 48 яркіх і разнастайных удзельнікаў — юных спевакоў, дэкламатараў, акцёраў, музыкантаў, акрабатаў, танцораў, сярод якіх ці салісты, так і зладжаныя калектывы, — будуць здзіўляць прафесійнае журы і гледачоў сваімі мастацкімі здольнасцямі. У фінал праекта трапяць толькі 10 наймацнейшых канкурсантаў, з якіх суддзі выберуць двух пераможцаў, па адным у кожнай узроставай катэгорыі (5—10 і 11—15 гадоў), а публіка — уладальніка спецыяльнага прыза глядацкіх сімпатый.

# ШОУ МУСІЦЬ... УСПАМІНАЦЦА

**Напярэдадні 16-га міжнароднага дзіцячага конкурсу песні «Еўрабачанне», які, нагадаем, другі раз у гісторыі прымае наша краіна, тэлеканал «Беларусь 3» ладзіць своеасаблівую рэтраспектыву папярэдніх конкурсаў.**

Ужо з 5 лістапада ў вячэрнім эфіры па буднях гледачы змогуць успомніць, як праходзіў нацыянальны адбор на дзіцячы конкурс пачынаючы з 2004 года, і наноў пачуць пераможнае «О-а-о» Ксеніі Сітнік (2005 год), «З сябрамі» Аляксея Жыгалковіча (2007) або прыгадаць «Чароўнага трусіка» Юрыя Дзямідовіча, які ўзарваў інтэрнэт у 2009-м і стаў, магчыма, адным з самых незвычайных і запамінальных беларускіх удзельнікаў. Чаму адлік вядзецца не з 2003 года, калі Беларусь дэбютавала на дзіцячым «Еўрабачанні» і быў, уласна, заснаваны сам конкурс? Бо першую нашу прадстаўніцу Вольгу Сацюк, якой на той час было 10 гадоў, выбіралі іншым чынам — як пераможцу нацыянальнага конкурсу юных талентаў «Сузор'е надзей». Дэбют, між іншым, атрымаўся вельмі неблагі — ураджэнка Кобрына заняла 4-е месца сярод 16 удзельнікаў.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**






# ШАХМАТНЫ КЛУБ

**Выпуск № 55**

Задача расійскага складальніка Аляксандра Феакціства *(гл. дыяграму)* сёлета атрымала другі пахвальны водгук на юбілейным конкурсе «Віктару Зайцаву — 50».



**Белыя:** Крс7, Фb3, Лd1, Лf7, Се8, Ке2, пп. d2, f2, f4, g4 (10).

**Чорныя:** Кре4, Лh8, Сb7, Сh6, Ке1, Кh1, пп. е5, g7, h5, h7 (10).

Мат у 2 хады.

Дасылайце рашэнні на адрас рэдакцыі (220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, «Звязда») або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

Як і абяцалі ў мінулым выпуску, працягваем расказ пра Сусветную шахматную алімпіяду ў Батумі. У яе жаночым турніры змагаліся 150 камандаў. Сярод удзельніц былі чэмпіёнка свету Цзюй Вэньцзюнь, экс-чэмпіёнкі А. Касцянюк, М. Музычук, Г. Ушэніна. Тройку прызёраў склалі: 1. Кітай; 2. Украіна — па 18 балаў; 3. Грузія (першая зборная) — 17. У дзясятцы найлепшых таксама Расія, Венгрыя, Арменія, ЗША, Індыя, другая зборная Грузіі і Азербайджан.

Наша жаночая зборная (капітан Андрэй Кавалёў) мела трыццаць шосты стартавы рэйтынг, але фінішавала на васямнаццатым месцы з 15 баламі і нават заваявала «серабро» ў сваёй рэйтынгавай групе «В». Пачалі беларускі з перамог над Мальтай (3,5:0,5) і Харватыяй (2,5:1,5), потым саступілі Манголіі (1,5:2,5), перамаглі Туркменію (2,5:1,5), прайгралі Казахстану (1:3) і Нарвегіі (1,5:2,5). І тут удалося атрымаць тры перамогі запар: над Сальвадорам і Партугаліяй — па 4:0, над Швецыяй — 3,5:0,5. Пасля нічыёй (2:2) са Славеніяй нашы суайчынніцы ў апошнім туры перамаглі Ізраіль з лікам 2,5:1,5.

На першай дошцы Вольга Бадэлька набрала 5,5 ачка з 10 (3 перамогі, 1 пройгрыш, 5 нічыіх). У Ланіты Сцяцко — 6 з 10 (+4-2=4), у Наталлі Кусянковай — 5,5 з 9 (+3-1=5), у Яны Ільючык — 7 з 10 (+6-2=2), у запасной Марыі Каляўдзіч — 4,5 з 6 (+3-0=3).

Вось некалькі пераможных партый беларускіх шахматыстак.

Яна Ільючык — Вольга Васільеў (Ізраіль). 1.е4 с5 2.Кf3 Кс6 3.d4 cd 4.К:d4 Кf6 5.Кс3 е5 6.Кdb5 d6 7.Сg5 а6 8.Ка3 b5 9.Кd5 Се7 10.С:f6 С:f6 11.с4 b4 12.Кс2 0-0 13.Се2 Сg5 14.0-0 а5 15.Фd3 Се6 16.Лad1 g6 17.Сf3 Ла7 18.b3 Лd7 19.Фе2 Крh8 20.Сg4 f5 21.Сh3 Кb8 22.f4 ef 23.Кd4 С:d5 24.cd Сf6 25.Ке6 Фb6+ 26.Крh1 Лс8 27.ef g5 28.Фh5 Лg8 29.Сg4 Ле7 30.Лf3 Кd7 31.Фh6 Фа6 32.Лh3 Фс8 33.Лhd3 Фс2 34.Л3d2 Фс3 35.Ле2 Лf7 36.Сh5 Ле7 37.Сg4 Лf7 38.Сh5 Ле7 39.h3 Фg3 40.Сf3 Се5 41.Лс1 Лf7 42.Лс7 Фh4 43.Ф:h4 gh 44.Ле4 Ла8 45.Лес4 Крg8 46.Сh5 Л:f5 47.Сg4 Лf7 48.Кg5 Лg7 49.Лс8+ Л:с8 50.Л:с8+ Кf8 51.Се6+, 1:0.

Іна Агрэст (Швецыя) — Вольга Бадэлька. 1.е4 с5 2.Кf3 Кс6 3.d4 cd 4.К:d4 е5 5.Кb5 d6 6.К1с3 а6 7.Ка3 Се7 8.Се3 Кf6 9.Кс4 b5 10.Кb6 Лb8 11.К:с8 Ф:с8 12.Се2 0-0 13.0-0 Лd8 14.а3 Ка5 15.а4 Кс4 16.С:с4 bc 17.Сg5 Л:b2 18.С:f6 С:f6 19.Кd5 Ле8 20.Ла3 Сd8 21.Лg3 g6 22.Фе2 Ла2 23.Фd2 Л:а4 24.h4 с3 25.Л:с3 Фg4 26.Ке3 Ф:е4 27.Ф:d6 С:h4 28.Лс7 Лd4 29.Ф:а6 С:f2+ 30.Л:f2 Ф:е3 31.Л:f7 Лd1+ 32.Крh2 Фh6+ 33.Крg3 Фg5+ 34.Крh3 Лh1х

Ланіта Сцяцко — Джэсіка Бенгтсан (Швецыя). 1.е4 е5 2.Кf3 Кс6 3.Сb5 Кf6 4.0-0 Сс5 5.с3 0-0 6.d4 Сb6 7.С:с6 dc 8.К:е5 К:е4 9.Фf3 Кg5 10.Фg3 Ке4 11.Фf3 Кg5 12.Фh5 Ке4 13.а4 а5 14.Се3 Се6 15.Ка3 f6 16.Кес4 Кd6 17.Кd2 Кf5 18.Лfе1 Фd7 19.Кас4 Кd6 20.К:d6 cd 21.d5 Сg4 22.Фh4 С:е3 23.Л:е3 cd 24.Лае1 Лf7 25.h3 Сf5 26.Фd4 Фс6 27.с4 Сd7 28.b3 dc 29.К:с4 d5 30.Кb6 Лd8 31.К:d5 Крf8 32.Ке7 Фс7 33.Фh4 Фс2 34.Л1е2 Фb1+ 35.Ле1 Фс2 36.Л1е2 Фb1+ 37.Крh2 Ле8 38.Фd4 Лf:е7 39.Л:е7 Л:е7 40.Фd6 Фf5 41.Л:е7, 1:0.

* * *

Рашэнне задачы з мінулага выпуску: 1.Фа2. Першымі правільна адказалі Аляксандр Сямерыч, Ігар Ананіч, Уладзімір Ізотаў, Віктар Жук, Сяргей Цяльпук.

**Вадзім ЖЫЛКО.**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ




## Сядзі і глядзі

# ПРА ЖЫВЁЛ І НЕ ТОЛЬКІ



### «МЫ НАБЫЛІ ЗААПАРК»

**ТБ3, 6 лістапада**

Сямейства Мі на апошнія грошы набыло стары і амаль закінуты правінцыйны заапарк, каб выратаваць яго насельнікаў ад гібелі. Але каб утаймаваць дзве сотні экзатычных жывёл, адрэстаўраваць і зноў адкрыць для наведвальнікаў заапарк, дарослым і дзецям давядзецца добра папацець. Зрэшты, паколькі гэта сямейная камедыя (між іншым, заснаваная на рэальнай гісторыі!), то скончыцца ўсё добра.

### «ЧАЛАВЕК-МУРАШКА»

**«Беларусь 2», 7 лістапада**



Герой чарговага кінакомікса ад кампаніі Marvel — махляр Скот Лэнг, які выпадкова атрымлівае шанц змяніць сваё жыццё. Дзякуючы звыштэхналагічнаму касцюму ён можа памяншацца ў памерах, валодаючы пры гэтым надзвычайнай фізічнай сілай. Цяпер ён мусіць стаць супергероем і дапамагчы свайму настаўніку доктару Хэнку Піму захаваць у сакрэце гэту распрацоўку ад пагроз новага пакалення... Крытыкі, дарэчы, называюць гэты фільм самым смешным, але адначасова і самым слабым у кінасусвеце Marvel.



### «САБАЧАЕ СЭРЦА»

**«Беларусь 3», 7 і 9 лістапада**

Масква, 1924 год. Слынны хірург, прафесар Праабражэнскі, праводзячы даследаванні па магчымасцях чалавечага арганізма, перасаджвае гіпофіз і семявыя залозы донара — алкаголіка і дэбашыра Кліма Чугункіна, які загінуў у п'янай бойцы, сабаку Шарыку. Вынікі аперацыі пераўзышлі чаканні: Шарык страціў поўсць, стаў на ногі, пачаў размаўляць і нават... уладкаваўся на працу ў аддзел ачысткі горада ад бадзяжных жывёл. Але персанаж, які атрымаўся з былога сабакі, ператварыў жыццё прафесара ў суцэльнае пекла.

### «ПАЛАСАТЫ РЭЙС»

**АНТ, 9 лістапада**



Ён — Алег Пятровіч, сур'ёзны старшы памочнік капітана на сухагрузе «Яўген Анегін», яна — буфетчыца Марыяна, трохі шалапутная, але добрая і разам з тым упартая пляменніца капітана, яны — «група ў паласатых купальніках», альбо папросту тыгры і леў. Уся гэта кампанія плыве на адным караблі з невядомай трапічнай краіны ў Адэсу. І магчыма, не было б у падарожжы ні рамантыкі, ні эксцэнтрычнай камедыі, але ў справу ўступае шкадлівы шымпанзэ...



### «ВЫХАВАННЕ І ВЫГУЛ САБАК І МУЖЧЫН»

**«Беларусь 1», 10 і 11 лістапада**

Ветэрынар Соня вельмі любіць сваіх падапечных, аднак у стасунках з людзьмі, асабліва з мужчынамі, «заштрыльваецца на ўсе гузікі». Пасля звальнення з ветклінікі яна падпрацоўвае выгулам чужых сабак. Спартсмен Арцём, які аднаўляецца пасля сур'ёзнай траўмы, робіць стратэгічную памылку: дорыць сваёй нявесце шчанюка, але тая выстаўляе каханага за дзверы, і цяпер дзяўчыны ў яго няма, затое ёсць сабака, з якім штодня трэба гуляць. Ці ж дзіўна, што аднойчы шляхі гэтых двух перасякаюцца?

# У пантофлях ды па бруку

**Штотыдзень у эфіры тэлеканала «Беларусь 3» тэлевіктарына «Размаўляем па-беларуску». Для таго каб стаць яе ўдзельнікамі, неабходна зайсці на сайт tvrgomel.by або 3belarus.by і праз банер «Размаўляем па-беларуску» запоўніць заяўку на каманду з трох чалавек. Ну а праверыць сваё веданне роднай мовы пасля таго, як праграма выйшла ў эфір, можна з дапамогай «Звязды». Ці ведалі вы, што:**

**грэ́бля** — насыпная дарога цераз балота;

**ло́кшына** — страва ў выглядзе тонкіх палосак цеста;

**прыі́кры** — непрыемны, брыдкі;

**бо́рзды** — хуткі, жвавы;

**панто́флі** — дамашнія туфлі без задніка;

**брук** — укладзеная каменем частка вуліцы;

**на славу** — 1) вельмі добра; 2) вельмі добры, цудоўны (беларусы яшчэ скажуць: *будзь здароў, дзякуй богу, люба-дорага;* рускія: *на пять с плюсом, пальчики оближешь*);

**без галавы** — пра чалавека неразумнага, недалёкага, тупаватага ці няўважлівага (беларускія сінонімы: *без клёпкі ў галаве, куст альховы;* руская адпаведнікі: *без царя в голове, голова садовая*).

**Паўторы выпускаў тэлевіктарыны — у ранішнім эфіры «Беларусь 3» кожную суботу.**

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## Беларусь 1

**6.45 Меладрама «Выхаванне і выгул сабак і мужчын» (12+).**
**8.30** «Гісторыі выратавання» (12+).
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** «Арсенал». (12+).
**9.45** «Маршрут пабудаваны». Пінск (12+).
**10.25** «Народная раніца» (6+).
**11.05** «Вакол планеты».
**12.10** Навіны. Цэнтральны рэгіён.
**12.35** «50 рэцэптаў першага» (12+).
**13.15 Меладрама «Каралева пры выкананні» (16+).**
**15.15** «Твой горад».
**15.30** «Клуб рэдактараў» (16+).
**16.05 Меладрама «Выйсці замуж любой цаной» (12+).**
**20.15** «Light up!» Дзённік міжнароднага дзіцячага конкурсу «Еўрабачанне-2018».
**20.35** Навіны надвор'я.
**21.00** «Галоўны эфір».
**22.10 Меладрама «Усё яшчэ будзе» (12+).**

## Беларусь 2

**7.00** М/с «Усё пра Розі» (0+).
**7.30 Фільм для дзяцей «Краіна небывалага багацця» (12+).**
**8.30, 20.05** «Тэлебарометр».
**8.35** М/с «Чып і Дэйл спяшаюцца на дапамогу» (0+)
**9.25** «Веру не веру» (16+).
**10.20** «ЖаннаДапамажы» (16+).
**11.20, 23.40** «Арол і рэшка» (16+).
**12.25 Баявік «Новы чалавек-павук» (12+)**
**14.45** «Вясельны памер» (16+).
**15.45** «Тата папаў» (16+).
**18.00** «Бітва экстрасэнсаў. 17-ы сезон» (16+).
**20.40** «Абмен жонкамі» (16+).
**22.00** «Спортлато 5 з 36», КЕНО.
**22.05** «Трэці лішні» (16+).
**23.05 «Сыграй мяне, калі зможаш» (12+).**

## Беларусь 3

**7.35** «Святыні Беларусі».
**8.00, 12.50, 20.15** Навіны культуры.
**8.20, 13.05, 20.35** «Гэты дзень».
**8.25 «Нясконачная аповесць». Меладрама (12+).**
**10.00** «Наперад у мінулае».
**10.30** «Беларуская кухня». Запечаная бульба з грыбамі.
**11.00** «Нацыянальны хіт-парад».
**11.55** «Майстры і куміры». Народная артыстка Беларусі Наталля Гайда.
**13.10** «Легенды кіно». Міхаіл Пугаўкін (12+).
**13.50 «Старшына». Маст. фільм (12+).**
**15.15** «Артэфакты». Крыж Ефрасінні Полацкай.
**15.45** Юбілейны канцэрт Аляксандра Дабранравава.
**17.35 «Памылка рэзідэнта». Дэтэктыў (12+).**
**20.00** «Архітэктура Беларусі». Палац Булгакаў у Жылічах.
**20.40** «Калыханка» (0+).
**21.05 «Дзень добры і бывай». Меладрама (12+).**
**22.40** «Вялікія мастакі». П'ер-Агюст Рэнуар (12+).
**23.35** «Святло далёкай зоркі». Памяці народнага архітэктара СССР Георгія Заборскага.

## Беларусь 5

**6.00** Змешаныя адзінаборствы. UFC.
**8.00** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Крыстал Пэлас» — «Тотэнхэм».
**9.55** Трэніровачны дзень.
**10.25** Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. БГК імя Мяшкова (Беларусь) — «Вівэ» (Польшча).
**12.00** Гульні «навырост».
**12.30** Піт-стоп.
**13.00** Бокс. Сусветная суперсерыя.
**14.50** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Ліверпуль» — «Фулхэм». (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**16.55** Валейбол. Чэмпіянат Расіі. Жаночы. «Дынама» (Масква) — «Мінчанка» (Мінск).
**19.00** Спорт-цэнтр.
**19.15** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Манчэстэр Сіці» — «Манчэстэр Юнайтэд». (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**21.20** Вынікі тыдня.
**22.05** Самба. Чэмпіянат свету.

## АНТ

**7.00, 9.00, 16.00** (з субцітрамі) «Нашы навіны».
**7.10 Камедыя «Дзелавыя людзі» (6+).**
**8.45** М/ф «Маша і Мядзведзь» (0+).
**9.10** «Нядзельная пропаведзь» (з субцітрамі).
**9.25** «Здароўе» (16+).
**10.20** «Анатоль Капскі: лініі жыцця» (12+).
**10.50** «Бесталковыя нататкі» (12+).
**11.10 Камедыя «Вяселле ў Малінаўцы» (6+).**
**12.55 Камедыя «Пакроўскія вароты» (12+).**
**15.30, 16.20** «Тры акорды» (16+).
**18.00** «Лепш за ўсіх!» (6+).
**20.00** «Контуры».
**21.05** «Клуб Вясёлых і Знаходлівых» (16+).
**23.15** Святочны канцэрт у Дзяржаўным Крамлёўскім палацы (12+).

## СТБ

**6.35** «Ежа багоў» (16+).
**8.15, 22.10** Дакументальны спецпраект (16+).
**10.00** «Вёска Live» (12+).
**10.50** «Цэнтральны рэгіён».
**11.20** 1/2 фіналу Міжнароднай лігі КВЗ. Першая гульня.
**13.30, 16.30** Навіны «24 гадзіны» (16+).
**13.40, 16.40, 20.35 «Пры загадкавых абставінах». Серыял (16+).**
**19.30** «Тыдзень».
**23.30** «Тыдзень спорту».
**0.00** «Сакрэтныя тэрыторыі» (16+).
**1.35** «Соль» (16+).

## МІР

**6.00, 8.05** М/ф (0+).
**6.15** «Мільён пытанняў аб прыродзе» (6+).
**6.30** «Беларусь сёння» (12+).
**7.05** «Ведаем рускую» (6+).
**8.20 Маст. фільм «Дзеці Дон-Кіхота» (12+).**
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15** «Яшчэ танней» (12+).
**10.45** «Культ/Турызм» (16+).
**11.15** «Здабытак рэспублік» (12+).
**11.50, 16.15, 19.30, 1.00 Серыял «Тульскі Токараў» (16+).**
**18.30, 0.00** «Разам».
**2.15 Серыял «Благая кроў» (16+).**

## РТР—Беларусь

**7.00 Маст. фільм «Сардэчныя раны» (12+).**
**10.30** «Смехапанарама Яўгена Петрасяна» (16+).
**11.00** Весткі.
**11.20** «Сам сабе рэжысёр» (16+).
**12.15** «Ранішняя пошта» (16+).
**13.00** «Калі ўсе дома» (12+).
**14.00** «Наша справа» (16+).
**14.15** «Гумар! Гумар! Гумар!!!» (16+).
**15.55** «Далёкія блізкія».
**17.05 Маст. фільм «Лёд, які не растае» (12+).**
**18.55, 21.45 Маст. фільм «Апалае лісце» (12+).**
**20.00** Весткі тыдня.
**0.00** Масква. Крэмль. Пуцін.
**0.50** «Нядзельны вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

## НТБ—Беларусь

**6.30** «Астрапрагноз».
**6.35 Серыял «Вяртанне Мухтара» (16+).**
**8.00, 10.00, 16.00** «Сёння».
**8.20** «Іх норавы» (0+).
**8.45** «Урачэбныя тайны плюс» (12+).
**9.15** «Хто ў доме гаспадар?» (16+).
**10.25** «Першая перадача» (16+).
**11.05** «Цуд тэхнікі» (12+).
**11.55** «Дачны адказ» (0+).
**13.10** «НашСпажыўНагляд» (16+).
**14.10 Серыял «Рускі дубль» (16+).**
**16.20** «Следства вялі...» (16+).
**18.05** «Новыя рускія сенсацыі» (16+).
**19.00** «Вынікі тыдня».
**20.05** «Зоркі сышліся» (16+).
**21.40** «Ты не паверыш!» (16+).
**22.35** «Зразумець і абясшкодзіць» (12+).
**23.10** «Філіп Кіркораў. Мая споведзь» (16+).
**0.15** Да юбілею НТБ. «Брэйн-рынг». Спецыяльны выпуск (12+).

## 8 канал

**7.00, 15.20, 18.55, 21.10, 1.05** «Надвор'е».
**7.05** М/ф «Баранчык Шон».
**7.15** Дак. серыял «Малява» (0+).
**8.00** М/ф «Кот Гром і зачараваны дом».
**9.25** «Утрэндия».
**9.30** «Мой любімы гадаванец» (0+).
**10.00 Прыгоды «Белае сонца пустыні» (16+).**
**11.25 Драма «Служылі два таварышы» (16+).**
**13.05 Маст. фільм «Спадары афіцэры» (16+).**
**15.25** «Стыльняшка».
**15.30 «Глядзім усёй сям'ёй». Фільм — дзецям «Па сакрэце ўсяму свету».**
**17.40** «Адказвайка».
**17.45** «Сябры дзядулі Марка» (0+).
**18.00 Серыял «Яна напісала забойства» (12+).**
**19.00 Драма «Прыбыццё» (16+).**
**20.55** «Вечарніца» (0+).
**21.15 Драма «Доктар Жывага» (18+).**







## ВТБ

**6.05, 12.45** Серыял «Мамачкі-2» (16+).
**7.10** М/ф «Чычылэнд» (0+).
**7.30** М/ф «Марын і яго сябры» (6+).
**8.00, 4.05** «Ералаш» (6+).
**8.40** Серыял «Сямейны бізнес» (12+).
**9.40** Драма «Каратэ-хлапец» (12+).



**13.50, 2.45** Серыял «Выжыць пасля» (16+).
**15.55** Серыял «Шчаслівыя разам» (16+).
**18.00, 0.40** «Уральскія пельмені» (16+).
**18.30** «Саюзнікі» (16+).
**20.00** Серыял «Варонiны» (12+).
**22.00** Баявік «Апошні кінагерой» (12+).
**1.45** Серыял «Бязмоўны сведка» (16+).
**4.25** Серыял «Метад Лаўровай» (16+).

## Культура

**6.30** «Вясна». Маст. фільм.
**8.20** «Так сыдзе!» «Ну, пачакай!» М/ф.
**9.20** «Звычайны канцэрт».
**9.45, 0.35** «Карона Расійскай імперыі, або Зноў няўлоўныя». Маст. фільм.
**12.00** «Вясёлкавы свет прыроды Коста-Рыкі». Дак. фільм.
**12.50** XV Міжнародны фестываль «Масква сустракае сяброў».
**14.10** «Сяргей Шчукін. Гісторыя аднаго калекцыянера». Дак. фільм.
**15.05** «Музычная гісторыя». Маст. фільм.



**16.30** «Пешшу...» Масква рускастыльная.
**17.00** «Песня не развітваецца...» 1976—1977 гады.
**18.25** «Наш дом». Маст. фільм.
**20.00** «Эпоха Нікадзіма». Дак. фільм.
**21.25** «Ледзяное сэрца». Маст. фільм.
**23.05** «Зорны дуэт. Легенды танца». Гала-канцэрт зорак сусветнага бальнага танца ў Дзяржаўным Крамлёўскім палацы.
**2.50** «Дачка волата». М/ф для дарослых.

## Настальгія

**6.00** «Эліта Краіны Саветаў». Аляксандр Градскі. 2007 год (12+).
**6.45, 8.40, 13.15, 15.45, 17.15, 21.45, 1.15, 2.35, 3.45, 5.00** Музычная настальгія (12+).
**7.10** «Гэты фантастычны свет». «Уменне кідаць мяч». 1988 год (12+).
**9.00** «Быў час». 2009 год (16+).
**10.00** Маст. фільм «Пераклад з англійскай» (16+).
**12.00** Маст. фільм «Дзяўчына з характарам» (12+).
**13.30** «Вакол смеху». «Тэатр і смех». 1978 год (12+).
**15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**16.00** Маст. фільм «Печнікі» (16+).
**18.00** Маст. фільм «Транзіт» (16+).
**20.05, 23.00** «Песня-82» (12+).
**22.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**23.30** М/ф «У сінім моры, у белай пене...» (12+).
**0.10** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1965. 2-я частка. 2009 год (12+).
**1.30** «Шынок «13 крэслаў». 1968 год (12+).
**4.00** «Колба часу» (16+).

## EuroSport 1

**0.00, 8.30, 12.00** Лёгкая атлетыка. Марафон. Нью-Ёрк.
**1.05, 3.00, 7.00, 10.30, 13.30, 16.00, 20.00, 23.00** Футбол. Чэмпіянат MLS. Плэй-оф.
**5.00, 14.30** Снукер. International Championship. Фінал.
**17.30** Фігурнае катанне. Гран-пры Фінляндыі.
**19.30** Дзюдо. «Вялікі Шлем».
**21.30** Алімпійскія гульні.
**22.30** Алімпійскія гульні. «Алімпійская спадчына».

## Кінакамедыя

**0.45** Трымай удар, дзетка! (12+).
**2.50** All inclusive, або Усё ўключана! (16+).
**4.40** Усё ўключана-2! (16+).
**6.35** Містар Фелічыта (16+).
**8.20** Рыцары каралеўства крутасці (18+).
**10.00** Ажаніся са мною, чувак (18+).
**11.45** Секс па дружбе (16+).
**13.55** Прышэльцы (12+).
**16.00** Прышэльцы-2: калідоры часу (12+).
**18.20** Прышэльцы-3: узяцце Бастыліі (12+).
**20.30** Прышэльцы ў Амерыцы (0+).
**22.05** Няўдачлівыя (16+).
**23.55** Дублёр (16+).

## ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**7.45** «10 самых» (16+).
**8.15** «Доктар І...» (16+).
**8.45, 19.00, 2.00** «Вузел лёсу». Серыял (16+).
**10.20, 3.30** «Судовыя страсці». Дак. серыял (16+).
**12.05** «Асцярожна, махляры!» (16+).
**12.40** «Без падману» (16+).
**13.30** «Катоў крыўдзіць не рэкамендуецца». Дэтэктыў (12+).
**15.20, 22.00** «Нераскрытыя тайны» (12+).
**16.20** «Мой герой» (12+).
**17.10** «Развітанне» (16+).
**18.05** «Іх разлучыць толькі смерць». Дак. фільм (12+).
**20.55** «Гэтым пыльным летам». Серыял (12+).
**23.00** «Уся праўда» (16+).
**23.35** «Звышнатуральнае». Серыял (16+).
**0.25** «Сайлент Хіл-2». Жахі (18+).
**5.05** «Часова даступны» (12+).

## TV1000 ТБ1000

**6.10, 14.05** Маё вялікае грэчаскае вяселле-2 (16+).
**8.00** Немагчымае (16+).
**10.15** Каханне і сяброўства (12+).
**12.05** Я — легенда (16+).
**16.00** Пабочны эфект (16+).
**18.05** Філосафы: урок выжывання (16+).
**20.10** Фантастычнае каханне і дзе яго знайсці (16+).
**22.00** Гісторыя аднаго вампіра (16+).
**0.10** Скнара (16+).
**2.00** Бацькі і дочкі (18+).
**4.00** Бандыты (16+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Вій (12+).
**8.55** Абаронцы (12+).
**10.45** Білет на Vegas (16+).
**12.30** Іван Царэвіч і Шэры Воўк-3 (12+).
**14.15** Трымай удар, дзетка (12+).
**16.20, 4.15** Жанчына з лілеямі (16+).
**18.15** Пра каханне (16+).
**20.20** Землятрус (12+).
**22.25** Джунглі (12+).
**0.10** 22 хвіліны (16+).
**1.55** Дом (16+).

## National Geographic

**6.00** Панарама 360°. Аб'ект сусветнай спадчыны (16+).
**6.45** Гульні розуму (16+).
**8.00** Неверагодны доктар Пол (16+).
**9.30, 0.15** Асушыць акіян (16+).
**10.20, 2.35** Аўта-SOS (12+).
**11.05** Золата Юкана (16+).
**11.50** Ледзяная дарога (16+).
**12.35** Гаспадары гор (16+).
**13.25** Сіла племені (16+).
**14.10, 1.50** Дзікі тунец (16+).
**15.40** Расследаванні авіякатастроф (16+).
**17.15** Архітэктары старажытнасці (16+).
**18.00, 22.00, 1.05, 4.05** Адкрыццё страчанай магілы Ірада (16+).
**18.45, 23.30** Космас: прастора і час (16+).
**19.35** Сапраўдны геній (12+).
**20.20** Вядомы Сусвет (16+).
**21.10** Невядомая планета Зямля (12+).
**22.45** Космас: прамы эфір (16+).
**4.55** Інжынерныя ідэі (16+).
**5.40** Навуковыя недарэчнасці (16+).

## Discovery

**8.00, 16.00, 22.00** Махінатары.
**9.00, 17.00, 23.00, 5.30** Круты цюнінг.
**10.00, 15.00, 21.00** Як гэта ўстроена?
**11.00, 20.00** Склады.
**12.00, 1.00, 6.20** Зброя па-амерыканску.
**13.00** Разбуральнікі легенд.
**14.00, 4.40** Аляска: сям'я з лесу.
**18.00** Залатая ліхаманка.
**19.00, 2.00, 7.10** Скрозь кратовую нару.
**0.00** Біярыц: рускі кастам у Еўропе.
**2.55** Вулічныя гонкі.

### Беларусь 1

6.00, 7.20, 8.15 «Добрай раніцы, Беларусь!»
7.00, 8.00 (з сурдаперакладам), 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.40 Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 18.15. 0.20 «Зона Х» (16+).
9.10, 22.20 Серыял «След» (16+).
10.55, 12.10, 18.35, 19.20 Серыял «Жамчугі» (16+).
13.05 «Дзіцячы доктар».
13.35 «Дзень у вялікім горадзе».
14.35, 15.25 Серыял «Сухацвет. Рай там, дзе ты» (16+).
15.15, 18.00 Навіны рэгіёна.
17.05 «Беларуская часінка».
21.00 «Панарама».
21.50 «Жанчыны і спорт».
1.00 «Дзень спорту».

### Беларусь 2

7.00 «Тэлераніца» (12+).
9.00, 17.35 «Тэлебарометр».
9.10, 19.55 Серыял «Сляпая» (16+).
10.15, 22.05 «Экстрасэнсы-дэтэктывы» (16+).
11.25, 17.40 Серыял «Без тэрміну даўнасці» (16+).
13.40, 23.55 Серыял «Цэнтральная бальніца» (16+).
14.35 «ЖаннаДапамажы» (16+).
15.40 «Нічога сабе ньюз» (12+).
15.45, 23.05 «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект (12+).
16.30 «Вясельны памер» (16+).
20.55 «Трэці лішні» (16+).
22.00 «Спортлато 6 з 49», КЕНО.

### Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.35, 12.25 «Беларуская кухня». Поліўка з рашчынай.
8.05, 12.00, 19.55 Навіны культуры.
8.25, 12.20 «Гэты дзень».
8.30, 17.50 «Ганна Герман». Маст. фільм (12+).
9.25, 18.45 «Дзесяць фатаграфій». Святлана Святлічная (12+).
10.00 «Я хачу гэта ўбачыць!» Пінск. Частка 1-я (6+).
10.25 «Беларусь як песня». Тамара Раеўская.
10.55 «Майстры і куміры». Народны артыст СССР Валянцін Елізар'еў.
11.45 «Архітэктура Беларусі».
12.55 «Артэфакты». Рыцарскія даспехі з Мсціслава.
13.20, 21.05 «Чакаю і спадзяюся». Маст. фільм. 1-я серыя (12+).
14.25 «Невядомыя самалёты». Дак. фільм (12+).
15.05 «Партызаны». Вера Харужая (12+).
15.30 «Зялёны фургон». Маст. фільм (12+).
19.25 «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
20.15 «Беларуская кухня». Калатуха з блінамі.
20.40 «Калыханка» (0+).
22.15 «Песня для Еўрабачання. Пятнаццаць гадоў гісторыі». Фінал нацыянальнага дзіцячага конкурсу. 2007 год.

### Беларусь 5

7.10 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. «Ювентус» (Італія) — «Манчэстэр Юнайтэд» (Англія).
9.15 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Дзённік гульнявога дня.
10.00, 15.00 Легенды сусветнага спорту.
10.30 Жанчыны і спорт. Аляксандра Сасновіч.
11.00 Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Мужчыны. 96 кілаграмаў.
12.25 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. ЦСКА (Расія) — «Рома» (Італія).
14.30 Слэм-данк.
15.30 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. «Янг Бойз» (Швейцарыя) — «Валенсія» (Іспанія).
17.35 Авертайм.
18.10 Хакей. «Кубак чатырох нацый velcom». Беларусь — Францыя. (У перапынках — Спорт-цэнтр.)
20.30 Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Прэв'ю.
20.50 Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. БАТЭ (Беларусь) — «Чэлсі» (Англія).
22.50 Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. «Бардо» (Францыя) — «Зеніт» (Расія). (У перапынку — Спорт-цэнтр.)

### АНТ

6.00, 6.30, 7.00 (з субцітрамі), 7.30, 8.00 (з субцітрамі), 8.30, 9.00 (з субцітрамі), 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 (з субцітрамі), 20.30 Нашы навіны.
6.10, 7.10, 8.10 «Наша раніца».
9.10 «Сёння 8 лістапада. Дзень пачынаецца» (12+).
10.00 «Жыць здарова!» (16+).
11.10 «Кантрольная закупка» (12+).
11.50 «Модны прыгавор» (12+).
13.10 Серыял «Краіна 03» (16+).
15.00 «Давай пажэнімся!» (16+).
16.20 «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
17.30, 18.20 «На самай справе» (16+).
18.55 «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
19.00 «Няхай гавораць» (16+).
20.00 «Час».
21.10 «Маркаў. Нічога асабістага» (12+).
21.40 Серыял «Мажор» (16+).
22.50 Трылер «Уцёкі» (16+).
0.50 «Вячэрні Ургант» (16+).
1.40 «Нашы навіны». Галоўнае за дзень.

### СТБ

5.30 «Тыдзень спорту».
6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 Навіны «24 гадзіны».
10.10, 20.15 «Мінпшчына».
6.20, 7.45 «Раніца. Студыя добрага настрою» (6+).
9.10, 23.05 «Загадкі чалавецтва» (16+).
10.40, 20.45 «Шулер». Серыял (16+).
12.35, 23.55 «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
13.45 «Сакрэтныя тэрыторыі» (16+).
14.45 «Вадзіць па-руску» (16+).
15.15, 16.50 «Забіць Сталіна». Серыял (16+).
19.55, 23.00 «СТБ-спорт».
20.05 «Сталічныя падрабязнасці».
20.25 «Спецыяльны рэпартаж СТБ».
0.40 Дакументальны спецпраект (16+).

### МІР

6.00 «Трымайся, шоўбіз!» (16+).
6.30 Серыял «АСА» (16+).
8.05, 10.10 Серыял «Батальён» (12+).
10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 0.00 Навіны (бягучы радок).
13.15 «Зала суда. Бітва за грошы» (16+).
14.00, 1.40 «Справы сямейныя. Бітва за будучыню» (16+).
15.00, 2.25 «Справы сямейныя. Новыя гісторыі» (16+).
16.15, 0.40 «Гульня ў кіно» (12+).
17.10 Серыял «Вяртанне Мухтара-2» (16+).
19.20, 3.10 Серыял «Агент асобага прызначэння» (16+).
22.25, 0.10 Серыял «Жураў» (16+).
5.30 «Наша кіно. Гісторыя вялікага кахання» (12+).

### РТР—Беларусь

7.00 «Раніца Расіі».
11.00, 14.00, 20.00 Весткі.
11.25 «Пра самае галоўнае». Ток-шоу (12+).
12.35, 14.25, 20.40 Серыял «Гадуноў» (16+).
13.50, 16.50, 19.50, 23.00 Навіны — Беларусь.
15.35 «60 хвілін». Ток-шоу.
17.00 Весткі. Мясцовы час.
17.25 «Лёс чалавека» (12+).
18.35 «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
22.30, 23.10 Серыял «Дуэт па праве» (12+).
0.25 «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—Беларусь

5.55 «Астрапрагноз».
6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.55 «Сёння».
6.10 «НашСпажыўНагляд» (16+).
7.10 «Дзелавая раніца НТБ» (12+).
7.55, 8.05 Серыял «Вяртанне Мухтара» (16+).
9.40 «За гранню» (16+).
10.20 Серыял «Сведкі» (16+).
11.15 Серыял «Масква. Тры вакзалы» (16+).
13.25, 18.30 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
14.05, 16.35 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў» (16+).
17.25 «ДНК» (16+).
19.45 Серыял «Куба» (16+).
21.30 Серыял «Няўлоўныя» (16+).
23.25 «НЗ.by».
0.05 «Падазраюца ўсе» (16+).

### 8 канал

7.00, 15.55, 19.40, 21.05, 0.20 «Надвор'е».
7.05 М/с «Кунг-фу панда. Дзіўныя легенды».
7.30, 16.00 «Гумарынка».
7.35 Серыял «Два з паловай чалавекі» (16+).
8.40 Серыял «Блізняты» (16+).
9.35, 19.45 Серыял «Мост» (16+).
10.35 Серыял «Ад'ютант яго правасхадзіцельства» (12+).
11.45 Драма «Красная плошча» (12+).
14.00 Серыял «Імперыя пад ударам» (16+).
16.05 «Мультпарад» (0+).
16.30 «Мой любімы гадаванец» (0+).
17.00 «Сад і агарод».
17.15 «Адказвайка».
17.20 Серыял «Пражыць жыццё» (16+).
18.50 Серыял «Сакрэтныя матэрыялы» (16+).
19.35 «Фэшн is my прафэшн».
20.50 «Вечарніца» (0+).
21.10 «Даведнік па краінах і кантынентах» (0+).
21.20 Драма «Кромовъ» (16+).
23.20 Серыял «Блудлівая Каліфорнія» (18+).



### ВТБ

6.05, 12.45 Серыял «Мамачкі-3» (16+).
7.10 М/ф «Чычылэнд» (0+).
7.30 М/ф «Марын і яго сябры» (6+).
8.00, 3.50 «Ералаш» (6+).
8.20 Серыял «Сямейны бізнес» (12+).
9.25 Маст. фільм «Час першых» (12+).



12.10 Скетч-шоу «Асцярожна: дзеці» (6+).
13.50, 2.05 Серыял «Выжыць пасля» (16+).
15.55 Серыял «Шчаслівыя разам» (16+).
18.00, 0.00 «Уральскія пельмені» (16+).
19.00 Серыял «Івановы — Івановы-3» (16+).
20.00 Серыял «Варонін» (12+).
22.00 Камедыя «Сняданак у таты» (12+).
1.05 «Кіно ў дэталях» (16+).
4.25 Серыял «Метад Лаўровай» (16+).

### Культура

6.30, 7.00, 7.30, 8.20, 10.00, 15.00, 19.30, 23.10 Навіны культуры.
6.35 «Пешшу...» Масква чыгуначная.
7.05, 20.05 «Правілы жыцця».
7.35, 22.20 «Сіта і Рама». Серыял.
8.25 «Першыя ў свеце». Дак. серыял.
8.40, 16.25 «Два капітаны». Маст. фільм.
10.15 «Назіральнік».
11.10, 1.00 «Шчыра ваш... Раман Карцаў». 1992 год.
12.20, 18.40, 0.20 «Гульня ў бісер». «Яўген Вадалазкін. «Лаўр».
13.05 «Культурны адпачынак». Дак. серыял.
13.35 «Абсалютны слых».
14.15 Кіно пра кіно. «Аса. Хто кахае, той каханы». Дак. фільм.
15.10 Пернікавы домік. «Калевала».
15.40 «2 Вернік 2».
17.45, 2.10 Майстры выканальніцкага мастацтва.
19.45 «Галоўная роля».
20.30 «Добрай ночы, малыя!»
20.45 «Рускі свет Івана Тургенева».
21.40 «Энігма». Ільдар Абдразакаў.
23.30 «Хрустальная ноч. Яўрэйскі пагром — 1938». Дак. фільм.

### Настальгія

6.00 «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Бывай, 7 Лістапада...» 2005 год (12+).
6.50, 9.45, 12.50, 15.45, 17.00, 18.50, 21.45, 23.00, 23.35, 3.45 Музычная настальгія (12+).
7.00 Праграма «Тэма» з Уладзіславам Лісцьевым: «Ала Пугачова». 1992 год (12+).
7.40 «Зямля — Паветра». «Ночные снайперы». 2002 год (12+).
9.00, 15.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
10.00, 16.00, 22.00, 4.00 «Народжаны ў СССР» (12+).
11.00, 2.05, 5.00 «Песня-82» (12+).
12.00 «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар. 2007 год (12+).
13.05 Маст. фільм «Былы тата, былы сын» (16+).
14.30 «Ранішняя пошта». 1986 год (12+).
18.00 «Эліта Краіны Саветаў». Леанід Зорын. 2007 год (12+).
19.55 «Што? Дзе? Калі?» Першы паўфінал 1982 года (12+).
23.25 «Мастак і паэт Міхаіл Гробман чытае свае вершы». 1-я частка. 2005 год (18+).
0.00 Маст. фільм «Транзіт» (16+).



5.50 М/ф «У сінім моры, у белай пене...» (12+).

### EuroSport 1

0.00 Алімпійскія гульні. «Зала славы».
1.00, 11.30, 20.30 Алімпійскія гульні. «Алімпійская спадчына».
1.30, 5.00, 8.30, 12.00, 17.30 Футбол. Чэмпіянат MLS. Плэй-оф.
3.00 Watts.
3.30, 7.00, 13.30, 16.30, 23.00 Снукер. International Championship. Фінал.
10.30, 21.00 Дроны. DR1 Champions.
14.30 Фігурнае катанне. Гран-пры Фінляндыі.
20.00 Алімпійскія гульні. «Жывыя легенды».
22.00 Снукер. English Open. Фінал.

### Кінакамедыя

0.45 Любоўны менеджмент (16+).
2.45 Шпіён па суседстве (12+).
4.35 Ажаніся са мною, чувак (18+).
6.20 Лёгкія паводзіны (16+).
8.10 Сведка на вяселлі (16+).
10.00 Маё вялікае грэчаскае вяселле-2 (16+).
11.50 Даспехі Бога: у пошуках скарбаў (12+).
13.50 Выдатніца лёгкіх паводзін (16+).
15.35 Як выйсці замуж за мільярдэра (16+).
17.25 Секс па дружбе (16+).
19.30 Аферысты Дзік і Джэйн (12+).
21.10 Вячэра з прыдуркам (12+).
22.45 Вельмі страшнае кіно (16+).

### ТБ3

6.00 М/ф (6+).
7.25 «Школа доктара Камароўскага» (6+).
7.55 «Доктар І...» (16+).
8.25 «Вузел лёсу». Серыял (16+).
10.00, 3.45 «Судовыя страсці». Дак. серыял (16+).
11.40, 17.15 «Варажбітка» (12+).
12.45, 16.10 «Містычныя гісторыі» (12+).
13.50 «Адкрыта» з Аксанай Байрак (16+).
14.45 «Простыя складанасці» (12+).
15.20 «Натуральны адбор» (12+).
19.00, 2.15 «Адважныя жонкі». Серыял (16+).
20.45 «Гэтым пыльным летам». Серыял (12+).
21.45 «Савецкія мафіі» (16+).
22.35 «Дзікія грошы» (16+).
23.25 «Звышнатуральнае». Серыял (16+).
0.15 «Мумія-2». Фэнтэзі (12+).
5.15 «Нераскрытыя тайны» (12+).

### ТБ1000

6.10, 15.35 Немагчымае (16+).
8.30 Дывергент-2: інсургент (12+).
11.05 Скрыжалі лёсу (16+).
13.25 Махляры (12+).
18.00 Я — легенда (16+).
20.10 Белфегор — прывід Луўра (12+).



22.05 Саліст (16+).
0.20 Твін Пікс: скрозь агонь (18+).
2.50 Скнара (16+).
4.25 Фантастычнае каханне і дзе яго знайсці (16+).

### ТБ1000 Рускае кіно

6.20 Цёмны свет (16+).
8.25 Герой (12+).
10.15 Тэсты для сапраўдных мужчын (16+).
11.40 Вій (12+).
14.05 Прыцягненне (12+).
16.20, 4.35 Свірыдавы (16+).
18.20 Білет на Vegas (16+).
20.20 Без межаў (12+).
22.15 Нявеста (16+).
0.05 Дуэль. Пушкін — Лермантаў (12+).
2.50 Землятрус (12+).

### Discovery

6.00 Панарама 360°. Аб'ект сусветнай спадчыны (16+).
6.45 Гульні розуму (16+).
8.00 Неверагодны доктар Пол (16+).
9.30. 14.10, 2.25 Дзікі тунец (16+).
10.20, 3.10 Аўта-SOS (12+).
11.05 Золата Юкана (16+).
11.50 Ледзяная дарога (16+).
12.35 Гаспадары гор (16+).
13.20 Сіла племені (16+).
15.40, 18.00, 22.00, 1.35, 4.50 Расследаванні авіякатастроф (16+).
17.15, 22.45 Секунды да катастрофы (16+).
18.50, 0.00 Космас: прастора і час (16+).
19.35 Сапраўдны геній (12+).
20.20 Вядомы Сусвет (16+).
21.10 Невядомая планета Зямля (12+).
23.10 Гарачыя граніцы: Лацінская Амерыка (16+).
0.45 Асушыць акіян (16+).
5.35 Навуковыя недарэчнасці (16+).

### National Geographic

8.00, 16.00, 22.00 Махінатары.
9.00, 17.00, 23.00, 4.40 Круты цюнінг.
10.00, 15.30, 21.00 Як гэта ўстроена?
11.00, 20.00, 5.30 Склады.
12.00, 1.00, 6.20 Зброя па-амерыканску.
13.00 Забытая інжынерыя.
14.00, 3.50 Як устроены Сусвет.
15.00 Скрозь час і прастору.
18.00, 0.00 Залатая ліхаманка.
19.00, 2.00, 7.10 Скрозь кратовую нару.
2.55 Разбуральнікі легенд.

ВЫТВОРЧАСЦЬ

# ЦЯПЛІЧНУЮ ПЛЁНКУ — НА ГРАНУЛЫ

## Як прыватнае прадпрыемства вырашае экалагічную праблему раёна, і не толькі свайго

**Століншчына вядомая ў краіне вырошчваннем агуркоў, памідораў ды іншай агародніны. Сотні гектараў зямлі занятыя пад цяпліцы. А яшчэ нейкі дзясятак гадоў таму вялікай праблемай была плёнка, якую гаспадары цяпліц штогод тонамі выкідалі альбо складавалі. Нярэдка гэты шкодны сінтэтычны прадукт спальвалі, атручваючы паветра ў наваколлі. Аднойчы ў раёне праходзіла нават рэспубліканская нарада, на якой вырашалі, як утылізаваць плёнку.**



Цяпер гэтай праблемы не існуе. Прыватнае вытворча-гандлёвае ўнітарнае прадпрыемства «Столін-Перапрацоўка плёнкі» мае ярка выражаны экалагічны кірунак. Завод ператварае шкодныя адходы ў новую прадукцыю. Стварыў завод у гарпасёлку Рэчыца **столінскі прадпрымальнік Аляксандр ДЗЕРАВЕНКА** з групай аднадумцаў. На падставе рашэння выканкама ім прадалі былую вытворчую базу райсельгастэхнікі. Вядома, давялося рамантаваць памяшканні, даводзіць да ладу цэхі, каб потым паставіць станкі. І вось цяпер абсталяванне задзейнічана на поўную магутнасць. А на прадпрыемстве зараз працуе каля 60 чалавек. Завод існуе ўжо пяты год.

Калі ён быў яшчэ на стадыі станаўлення, упраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне райвыканкама выдзеліла пазыку пад стварэнне рабочых месцаў.

— Атрымалі тады 450 мільёнаў рублёў, — гаворыць Аляксандр Дзеравенка. — Хоць і невялікія былі грошы, але на той час дапамога выглядала вельмі своечасовай. З той пазыкай даўно разлічыліся, але з людзьмі сацыяльна ўразлівых катэгорый працягваем працаваць і цяпер. На прадпрыемстве маюць рабочыя месцы некалькі людзей з абмежаванымі магчымасцямі.

Завод працуе кругласутачна, без выхадных і святочных дзён. За суткі перапрацоўваецца ад трох да чатырох тон сыравіны. Цяпер прадпрыемства мае дагаворы больш чым з трыма сотнямі пастаўшчыкоў сыравіны. Плёнку і іншы пластык вязуць у Рэчыцу не толькі з Брэстчыны, але і з усіх абласцей Беларусі. Большая частка гатовай прадукцыі — гранулы — накіроўваецца ў Расію. Рэчыцкі смеццеперапрацоўчы завод — прадпрыемства з поўным цыклам вытворчасці. Сыравіну тут перабіраюць, сартуюць, потым мыюць у спецыяльных машынах, пасля гэтага пускаюць у станкі, якія выпрацоўваюць гранулы — сыравіну для іншай вытворчасці, каб пазней яна ператварылася ў карысную прадукцыю.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

ВОПЫТ

# ЧВЭРЦЬ СТАГОДДЗЯ БЕЗ ПАЦУКОЎ І ПРУСАКОЎ

Час, калі ўсе адходы жыццядзейнасці выкідаліся ў смеццеправоды, гамяльчане нават забылі. Разам з **намеснікам генеральнага дырэктара дзяржаўнага аб'яднання «ЖКГ Гомельскай вобласці» Алегам СПІРЫДОНАВЫМ** успамінаем, калі тое было. Не адразу, але па паперах знаходзім дату. Работу па закрыцці смеццеправодаў у Гомелі пачалі яшчэ ў 1994, а закончылі ў 2011 годзе. Столькі часу спатрэбілася, каб пераканаць жыхароў усёй вобласці ў відавочных плюсах. Няма смеццеправода — няма смуроду гніення і хлоркі, прусакоў і пацукоў, пажараў ад недакуркаў і грукату сярод ночы. Толькі сталыя людзі сёння прыгадаюць, як сістэматычна яны забіваліся і патрабавалі спецыяльнага тэхнічнага абслугоўвання, каб чысціць і дэзынфікаваць. Зніклі гэтыя з'явы з жыцця, цяпер толькі бульба ці каляскі захоўваюцца ў памяшканнях вакол гэтай прылады сумнеўнай зручнасці.



Фота Вольгі АНУФРЫЕВАЙ.

Тэхнікі, якая іх абслугоўвала, на Гомельшчыне цяпер няма адпаведна. Замест яе набыта новая, прыстасаваная пад так званыя еўракантэйнеры. Пры пагрузцы смецце з іх практычна не высыпаецца. Кантэйнер падкатваецца да машыны, тая сама адкрывае накрыўку і справа зроблена.

— Гомель — першы горад у Беларусі, у якім смеццеправоды ўвогуле зніклі, — падкрэслівае Алег Спірыдонаў. — Потым і па вобласці ўсе заварылі. Але ж галоўная мэта сёння — максімальна падзяляць і перапрацоўваць смецце. Гэта ж другасныя рэсурсы. Пры карыстанні смеццеправодам гэта немагчыма. Сёння жыхары Гомельшчыны прызвычаіліся да таго, каб выкідаць смецце ў розныя кантэйнеры. Большая частка гэта робіць.

> Гомель — першы горад у Беларусі, у якім смеццеправоды ўвогуле зніклі.

Цікаўлюся, ці сутыкаліся пры барацьбе за экалогію з супрацьлеглымі меркаваннямі.

— Канешне, — кажа Алег Віктаравіч. — Працэс пераканання доўгі, але таго варты. Былі супраць у асноўным асобныя людзі, якія прызвычаіліся да смеццеправодаў, і сталыя, каму зусім цяжка выходзіць з дому і несці смецце на пляцоўку. Але ж сёння ўсе пляцоўкі — у крокавай даступнасці.

Сапраўды, блізка ад свайго дома я налічыла пяць. У залежнасці ад таго, у які бок іду, там і выкідаю смецце. Дарэчы, усе пляцоўкі ўладкаваны, агароджаны. Канешне, здараецца, што іх перакульваюць, але ж вельмі рэдка.

Дзеці сёння актыўна ўключыліся ў дзейнасць па раздзяленні смецця: кампанія вясёлых янотаў у сродках масавай інфармацыі робіць сваю справу. Многія бацькі гавораць, што малыя цяпер не дадуць выкінуць смецце не ў тую скрыню, што яму адпавядае. Думаю, яны здольны пераканаць і бацькоў, і дзядоў, што клопат аб будучыні планеты варты яшчэ аднаго заваранага смеццеправода.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# ЗМЯНЯЦЬ ПАДЫХОДЫ ДА АДХОДАЎ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)***

— Пакуль мы не можам поўнасцю адмовіцца ад выкарыстання палігонаў, але пры гэтым павінны ўкараняць новыя тэхналогіі абыходжання з адходамі, што і закладзена ў змест Нацыянальнай стратэгіі па абыходжанні з цвёрдымі камунальнымі адходамі і другаснымі матэрыяльнымі рэсурсамі на перыяд да 2035 года, — тлумачыць **начальнік упраўлення рэгулявання абыходжання з адходамі, біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Мінпрыроды Вольга САЗОНАВА.**

Трапляючы на палігоны, адходы з кантэйнераў для змяшаных адходаў праходзяць дасартаванне. Але эфектыўнасць апошняга значна меншая, чым сартаванне непасрэдна ў кантэйнерах. Правезеныя ў смеццявозе ДМР перамешваюцца з арганічнымі адходамі і страчваюць сваю якасць. Каб яе аднавіць, перапрацоўшчыкі павінны выдаткаваць шмат сродкаў і часу. Практыка паказвае, што ўзровень вымання ДМР са змяшаных адходаў складае каля 10 %, тады як падчас дасартавання пасля паасобнага збору атрымліваецца выняць больш за 90 % ДМР.

— На маю думку, галоўная задача камунальных службаў і кожнага жыхара Беларусі падчас сартавання адходаў — аддзяліць мокрыя адходы (арганіку) ад сухіх, — кажа Наталля Блышчык. — Няхай нават у кантэйнер для пластыку трапяць адходы, якія не перапрацоўваюцца, але пры гэтым яны не забрудзяць карысныя ДМР.

### Інфармацыя + ініцыятыва

За апошнія гады наша краіна дасягнула значных вынікаў у выкарыстанні і перапрацоўцы пластыку і іншых відаў ДМР. Але па-ранейшаму ёсць праблемы са свядомасцю насельніцтва.

Сёння ідзе вялікая інфармацыйная кампанія пра паасобны збор адходаў, але яна, упэўнена Наталля Блышчык, павінна была пачацца да таго, як у нашых дварах з'явіліся кантэйнеры для пластыку, паперы і шкла. Так, Германіі і Швецыі для дасягнення значных поспехаў у галіне абыходжання з адходамі спатрэбілася 40—50 гадоў.

Увогуле, эксперт лічыць, што адзін з самых дзейсных спосабаў вырашэння «смеццевай» праблемы — прыватная ініцыятыва. Бо менавіта ад дзеяння канкрэтных людзей залежыць стан кантэйнернай пляцоўкі ў двары іх дома і, адпаведна, эфектыўнасць збору смецця. Ці ініцыятыва гандлёвай сеткі прадаваць, а не бясплатна раздаваць пакеты, паказвае прыклад для іншых — можна змяняць падыходы да пластыкавай упакоўкі самім, не чакаючы змен у заканадаўстве.

**Вераніка КОЛАСАВА.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# Выгадна, дык не ахвотна?

**Кіраўніцтва Віцебскага аблвыканкама патрабуе актывізаваць дзейнасць па нарыхтоўцы другасных матэрыяльных рэсурсаў. У прыватнасці, у першым паўгоддзі ў вобласці нарыхтавалі 37,2 тысячы тон — толькі 39 % ад гадавога плана.**

**Старшыня аблвыканкама Мікалай ШАРСНЁЎ** на пасяджэнні выканаўчага органа даў заданне актывізаваць працэс. Тым больш што тым, хто плённа займаецца адпаведнай дзейнасцю, гэта выгадна. У дзяржаве прадугледжаны адпаведны алгарытм, каб выдаткі акупляліся.

Што датычыцца нарыхтоўкі другасных матэрыяльных рэсурсаў у насельніцтва, яе ажыццяўляюць 190 прыёмных пунктаў. 60 % з іх адносяцца да сістэмы спажывецкай кааперацыі, астатнія — да ЖКГ.

У рэгіёне ёсць добрыя прыклады таго, як зборам і перапрацоўкай займаюцца ў адпаведнасці з патрабаваннямі часу. Напрыклад, першымі ў Прыдзвінскім краі паасобны збор і перапрацоўку бытавых адходаў на перадавым узроўні арганізавалі ў Наваполацку. На Біямехзаводздзе бытавых другасрэсурсаў, які працуе з 2010 года, летась пачалі перапрацоўку пластыкавых бутэлек. Раней тут займаліся толькі сартаваннем, пасля прасавання сыравіну адпраўлялі на Магілёўшчыну для далейшай перапрацоўкі.

Але падлічылі, што больш выгадна вырабляць дробную пластыкавую фракцыю — ПЭТ-флэкс і шматкі. У былых складскіх памяшканнях размясцілі адпаведны вытворчы комплекс. Магутнасці дазваляюць перапрацоўваць прыкладна палову пластыкавай бутэлечнай тары, якую збіраюць у вобласці.

**Кіраўнік прадпрыемства, дэпутат гарсавета Сяргей СЯМЕНЫЧАЎ**, у размове з карэспандэнтам «МС» дадаў, што ў выніку запуску лініі па вырабе пліткі і бардзюраў замест цэменту будзе выкарыстоўвацца палімер. Такім чынам, перапрацаваныя адходы дазволяць яшчэ больш зарабляць.

Тое, што немагчыма перапрацаваць, як вядома, адвозяць на палігоны. На жаль, ёсць факты, калі парушаюцца патрабаванні пры іх эксплуатацыі і ўтрыманні.

Як паведаміў **старшы памочнік пракурора Полацкага раёна Віталь ПАТАНЕЙКА**, сёлета ўстанавілі факты захавання другасных матэрыяльных рэсурсаў на палігоне і міні-палігонах для цвёрдых камунальных адходаў. Там жа былі адходы вытворчасці. Акрамя таго, былі ўстаноўлены парушэнні ў пытаннях агароджвання аб'ектаў захавання цвёрдых камунальных адходаў. Зафіксавалі і факты складзіравання цвёрдых камунальных адходаў на пад'язных пуцях да такіх аб'ектаў, парушэнні пры правядзенні ізаляцыі адходаў. Дырэктару Жыллёва-камунальнай гаспадаркі Полацка ўнеслі прадстаўленне аб ліквідацыі парушэнняў. Таксама па патрабаванні пракуратуры вінаватыя ў парушэннях прыцягнуты да дысцыплінарнай і адміністрацыйнай адказнасці.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# ГРОШЫ СА СМЕЦЦЯ

**Штодзень толькі Магілёў вывозіць на гарадскі палігон каля 300 тон смецця. Раённыя пляцоўкі для адходаў таксама працуюць на мяжы сваіх тэхнічных магутнасцяў. У Глуску і Клімавічах, напрыклад, яны наогул вычарпалі свой рэсурс. Ад усяго гэтага экалогія, вядома, не паляпшаецца.**

## КАМПОСТ ДЛЯ... ПАЛІГОНА

Пакуль Магілёўскі смеццеперапрацоўчы завод, на які дастаўляецца да 90 тысяч тон смецця ў год, у сярэднім дабывае з яго каля 11 % другасных матэрыяльных рэсурсаў (ДМР). Але зараз тут разглядаюць дастаткова перспектыўны план павелічэння гэтай лічбы. **Дырэктар завода Віталій КОКАТАЎ** расказаў пра эксперыментальны праект, які, спадзяюцца, палепшыць паказчыкі:

— Мы збіраемся вылзеліць пляцоўку пад кампаставанне арганічных адходаў, якія трапляюць да нас ад насельніцтва. Кампост можна потым выкарыстоўваць у якасці грунту, якім на палігоне мы перасыпаем адходы. Па тэхналогіі кожныя два метры адходаў трэба перамяжоўваць 25 сантыметрамі грунту. Пакуль для гэтага выкарыстоўваецца звычайная глеба. А ў перспектыве мы зможам падоўжыць тэрмін эксплуатацыі палігона, а таксама на 15 % павысіць колькасць здабытых другасных рэсурсаў.

Прадпрыемства не толькі выбірае ДМР, але і само яго часткова перапрацоўвае. Тут знайшлі спосаб ператварэння поліэтылену высокага ціску ў гранулы. Штомесяц на заводзе асвойваюць 10 тон «плёначных» адходаў. А з гранул розныя перапрацоўшчыкі робяць запатрабаваныя тавары народнага спажывання, пачынаючы ад сметніц, заканчваючы бамперамі для аўтамашын.

А вось раслінныя адходы і апалую лістоту завод пускае на «корм» каліфарнійскім чарвякам. Грунт ад смеццеперапрацоўчага завода ў дасведчаных аматараў-кветкаводаў карыстаецца вялікім попытам. Пасля таго як яго ўгнаілі тутэйшыя чэрві, на ім можа заквітнець нават сухі пень.

У маштабах вобласці сартавальныя лініі працуюць таксама ў Бабруйску, Клімавіцкім, Касцюковіцкім, Кіраўскім, Быхаўскім, Шклоўскім, Асіповіцкім, Горацкім і Крычаўскім раёнах. Існуючыя магутнасці дазваляюць сартаваць каля 150 тысяч тон ЦКА — 30 % ад усіх адходаў.

## СМЕЦЦЕПРАВОД НА ЗАМКУ

Паасобны збор камунальных адходаў для паловы магілёўчан пакуль не актуальны, бо яны ўсё яшчэ карыстаюцца смеццеправодамі. Але налета плануецца гэту праблему вырашыць.



Фота Максіма ШАСТАКОВА.

**Намеснік генеральнага дырэктара па добраўпарадкаванні Магілёўскага УКП Яўген ШАМЯНКОЎ** удакладняе:

— Пакуль у горадзе застаецца 207 дамоў з дзеючымі смеццеправодамі, амаль палова ад агульнай колькасці існаваўшых. Рашэнне адмовіцца ад іх павінны прымаць самі жыхары. Але гэта той выпадак, калі трэба людзей пераконваць. Вядома, што выйсці на пляцоўку і апусціць у спецыяльную шахту пакет са смеццем лягчэй. Але трэба разумець, што тут і агульны санітарны фон парушаецца, і затраты большыя. Бо, калі машына прыязджае па смецце ў адно месца, гэта абыходзіцца танней, чым калі яна прыпыняецца каля кожнага пад'езда. Плюс догляд самога смеццеправода каштуе грошай і патрабуе дадатковых рабочых рук.

Спецыяліст спадзяецца, што са смеццеправодамі атрымаецца разабрацца да канца наступнага года.

Дарэчы, з 20 тысяч кантэйнераў, якія існуюць на сённяшні дзень у вобласці, 12,4 тысячы прызначаны для раздзельнага збору адходаў. І штогод апошніх становіцца болей. Сёлета, напрыклад, у разрад паасобных пераведзена больш за 1000 кантэйнераў.

## НАМ БЫ ЗАВОДЗІК

Некалькі гадоў таму ў краіне праводзілася маштабная аптымізацыя міні-палігонаў для цвёрдых бытавых адходаў. Сёння ў Магілёўскай вобласці 120 палігонаў, 99 з якіх міні.

**Начальнік адзела добраўпарадкавання ЖКГ Магілёўскай вобласці Дзяніс СІЛАКОЎ** кажа, што тэмпы скарачэння міні-пляцовак для адходаў запаволіліся, бо паўстала задача, што акрамя іх больш няма дзе ўтылізаваць:

— Працэс працягваецца, але не такімі аб'ёмамі. Калі раней закрывалася да 200 міні-палігонаў у год, то зараз 10—12. Праблема ў іншым. Сёння некаторыя раённыя «сметнікі» запоўнены на 100 %. Трэба іх рэкультываваць і шукаць новыя пляцоўкі. Звяртаем увагу на гэта інвестараў, бо ў бюджэце грошай не хапае.

Нягледзячы на тое, што колькасць палігонаў памяншаецца, альтэрнатывы ім пакуль няма.

Некалькі гадоў таму давялося пісаць пра аднаго літоўскага прадпрымальніка, які прапаноўваў зрабіць на тэрыторыі Магілёўскай вобласці завод па сартаванні і перапрацоўцы камунальных і бытавых адходаў з камбінаванай вытворчасцю ў электрычную і цеплавую энергію. Маўляў, ёсць у Еўропе бізнесмены, якія гатовыя ўкласці ў гэтую справу каля 195 мільёнаў еўра. Для рэалізацыі праекта патрабаваліся прыблізна пяць гектараў зямлі і магчымасць падключэння да цеплавых і электрычных сетак, каб транспартаваць атрыманае на камунальных адходах цяпло і электраэнергію ў горад. Аб'ект, запэўніваў літовец, абсалютна бяспечны і экалагічна чысты. І прыводзіў у прыклад княства Манака, дзе смеццеперапрацоўчы завод знаходзіцца ў цэнтры горада і выглядае як оперны тэатр. Але «опернага тэатра» ў Магілёве чамусьці так і не атрымалася.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

## АРТ-АБ'ЕКТЫ НА ВАРЦЕ ЧЫСЦІНІ

### У Гродне з'явіліся арыгінальныя сметніцы

Іх пачалі рабіць на Гродзенскім заводзе па ўтылізацыі і сарціроўцы адходаў. Першая сметніца з'явілася ў вобразе ветлівага джэнтльмена, які гатовы зняць капялюш перад тымі, хто не смеціць і правільна ўтылізуе адходы. Гэты факт не застаўся па-за ўвагай не толькі гараджан, але і шматлікіх турыстаў. Каля сметніцы сталі рабіць сэлфі і выкладваць у інтэрнэт.




На завод сталі паступаць прапановы з розных куткоў краіны і Расіі. Некаторымі эскізамі вытворцы зацікавіліся. Так, у горадзе з'явілася дама з сабачкам, а за ёй і вясёлы дворнік. Усяго ўстанавілі 18 сметніц-інсталяцый. Кажуць, што іх перадалі на баланс горада як малыя архітэктурныя формы.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

# Пазбавіцца ад непатрэбных рэчаў

**Салігорск лідзіруе сярод гарадоў Беларусі па шчыльнасці забудовы і насельніцтва — на квадратным кіламетры пражывае больш як 11 тысяч чалавек. Камунальныя службы прыкладаюць шмат намаганняў, каб гарадскія кварталы не патаналі ў смецці.**

— Найпершая наша задача — атрымаць як мага больш другасных матэрыяльных рэсурсаў для перапрацоўкі. Гэта пластык, шкло, папера, — расказаў **выконваючы абавязкі дырэктара камунальнага нарыхтоўчага ўнітарнага прадпрыемства «ЭкаКомплекс» Валерый ЕРМАКОВІЧ.** — У Салігорскім раёне дзейнічаюць тры асноўныя сістэмы іх збору. Кантэйнерная — гэта раздзельны збор адходаў у месцах, дзе яны назапашваюцца. Акрамя таго, нарыхтоўка вядзецца ў стацыянарных і перасоўных прыёмных пунктах, а таксама — з дапамогай тэхналагічнай сартавальнай лініі. Раздзельным зборам адходаў ахоплены Салігорск і ўсе населеныя пункты раёна.

У горадзе з прычыны вельмі шчыльнай забудовы ўладкаваць кантэйнерныя пляцоўкі бывае даволі складана. Таму прадпрыемства пачало ўстанаўліваць на ўнутраных дваровых тэрыторыях кантэйнеры заглыбленага тыпу. Адзін замяняе сабой шэсць звычайных кантэйнераў. Акрамя таго, у ім больш нізкая тэмпература, што замаруджвае працэсы гніення. Усяго ж на тэрыторыі горада і раёна больш за 1500 кантэйнераў для раздзельнага збору бытавых адходаў, у тым ліку 45 заглыбленых.

У мікрараёне Памесце Салігорска «ЭкаКомплекс» укараніла спосаб збору адходаў па галандскай сістэме ў рознакаляровыя поліэтыленавыя мяшкі. Жоўтыя прызначаны для пластыку, зялёныя — для паперы і кардону, сінія — для шкла. Па два камплекты раздалі домаўладальнікам. Вывозяцца адходы па графіку. Тара вяртаецца гаспадарам.

На базе прадпрыемства створаны рэгіянальны цэнтр па зборы зношаных шын. Жыхары горада і раёна маюць таксама магчымасць здаць элементы, якія змяшчаюць ртуць, энергазберагальныя лямпы, батарэйкі ў стацыянарныя пункты прыёму другаснай сыравіны. Працуе на прадпрыемстве і тэхналагічная лінія сартавання другасных матэрыялаў, дзе яны праходзяць дасартоўку па відзе і колеры. Другасную сыравіну прымаюць у трох стацыянарных прыёмных пунктах Салігорска, гарадскім пасёлку Чырвоная Слабада і ў вёсцы Дубеі. Калі ў кагосьці няма такой магчымасці, то нарыхтоўшчык забярэ яе машынай.

Сёлета ў жніўні арганізавалі платны збор бытавой тэхнікі ад насельніцтва, якая выйшла з ужывання. Цяпер усе ахвотныя могуць не толькі выслабаніць свае памяшканні ад рэчаў, якія перашкаджаюць, але і папоўніць сямейны бюджэт. За кожны кілаграм вагі ім выплачваецца па 25 капеек.

«ЭкаКомплекс» рэгулярна ладзіць акцыі па нарыхтоўцы другасных рэсурсаў сярод насельніцтва. Жыхары Салігорскага раёна актыўна ў іх удзельнічаюць. Каму ж перашкодзіць лішні рубель! Напрыклад, жыхарка пасёлка Чыжоўка ў красавіку здала ў перасоўны прыёмны пункт каля 300 кілаграмаў шкла і 50 кілаграмаў ПЭТ-бутэлек за адзін раз. І такіх сумленных людзей становіцца ўсё больш.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# НУЛЬ АДХОДАЎ

**Паводле звестак спецыялістаў, адзіны палігон для камунальных адходаў сталіцы «Трасцянецкі» напаўняецца ў пяць разоў хутчэй, чым было запраектавана. Гэта значыць, што ўжо праз некалькі гадоў, калі не зрабіць канкрэтных захадаў, Мінск можа сутыкнуцца з сур'ёзнымі наступствамі.**

— Перапрацоўка не выратоўвае нас ад праблемы, — гаворыць Наталля Блышчык. — Гэта дзейнасць — усяго толькі трэцяя ступень у пірамідзе эфектыўнасці абыходжання з адходамі пасля прадухілення ўтварэння і паўторнага выкарыстання. Таму трэба звяртаць больш увагі на скарачэнне тавараў, якія не перапрацоўваюцца або з'яўляюцца аднаразовымі, што адпаведна прывядзе да скарачэння і колькасці адходаў.

Але пакуль у гэтай галіне ў Беларусі няма заканадаўчых актаў, якія б рэгулявалі вытворчасць пластыкаў. Таму, напрыклад, вытворцы тавараў з полістыролу (які амаль не перапрацоўваецца) і поліэтыленцэрэфталату (добра перапрацоўваецца) знаходзяцца ў аднолькавых умовах.

— Нам неабходна зменшыць колькасць утварэння адходаў, скараціць вытворчасць тавараў, якія немагчыма перапрацаваць, а бізнесу глядзець у бок прапановы людзям безадходных альтэрнатыў, — упэўнена суразмоўніца.

З гэтым згодныя і ў Мінпрыроды. Прыродаахоўнае ведамства некаторы час таму выступала з прапановай эканамічнага стымулявання вытворцаў і пастаўшчыкоў тавараў з матэрыялаў, якія могуць паўторна перапрацоўвацца. Па словах Вольгі Сазонавай, Мінпрыроды будзе і далей працаваць над тым, каб у краіне ўкараняліся малаадходныя тэхналогіі, у тым ліку стымулявалася выкарыстанне шматзваротнай упакоўкі.

**Вераніка КОЛАСАВА.**



Фота Максіма ШАСТАКОВА.

# ПЕРАПРАЦОЎКА — СПРАВА ВЫГАДНАЯ

## Ці пашырацца магутнасці Гродзенскага смеццесартавальнага завода?

**Зараз ён абслугоўвае толькі горад, але ёсць магчымасць, каб прыняць адходы з усяго Гродзенскага раёна. Цяпер у раёне дзейнічае 15 міні-палігонаў, але камунальныя службы і мясцовыя ўлады не спяшаюцца скіраваць смеццевыя патокі на перапрацоўчы завод.**

Гродзенскі раён — адзін з самых населеных у вобласці, тут пражывае амаль 50 тысяч чалавек. З іх у гарадзе-спадарожніку Скідзелі — больш за 10 тысяч. Зразумела, што і адходаў утвараецца нямала. Напрыклад, у Гожскім сельскім Савеце адных толькі садаводчых таварыстваў каля 40, і ў сезон смецце ледзь паспяваюць вывозіць. Між тым да раздзельнага збору адходаў справа пакуль не дайшла. Праўда, была спроба зарыентаваць жыхароў і дачнікаў на збор палімераў, але яна не дала вынікаў: у кантэйнер па звычцы выкідалі ўсё разам.

Вывозяцца на палігон і адходы вялікай Скідзельскай зоны. У сельскім Савеце расказалі, што чулі аб планах па закрыцці палігона, які знаходзіцца на тэрыторыі сельсавета, але гэтыя пытанні не ў кампетэнцыі мясцовых улад. Дарэчы, такую сітуацыю, калі смецце вывозіцца адразу на палігон, можна назваць тыповай не толькі для Гродзенскага, але і многіх іншых раёнаў. З той розніцай, што на тэрыторыі раёна вось ужо другі год дзейнічае смеццесартавальны завод, магутнасцю 120 тысяч тон у год. Як паведаміў **дырэктар завода Вячаслаў АНДРЫЕЎСКІ**, магчымасці для перапрацоўкі ёсць.

— Завод прымае камунальныя адходы толькі з абласнога цэнтра. Гэта звязана з заварваннем гарадскіх смеццеправодаў і арганізацыяй раздзельнага збору другаснай сыравіны. Працэс можна лічыць наладжаным. Доля адсартаваных адходаў значна ўзрасла. Мы гатовы прыняць яшчэ больш смецця ад насельніцтва і адсартаваць яго, — адзначыў дырэктар.



На заводзе наогул выйшлі з ініцыятывай закрыцця навакольных міні-палігонаў. Аргумент важкі — адсутнасць ліній сартавання. Таму ўсе адходы, у тым ліку другасная сыравіна, трапляюць на сметнік. Выгляд другаснай сыравіны вельмі ўражвае экскурсіі, якія часта сюды прыязджаюць, заўважае дырэктар завода. Наогул, перапрацоўка адходаў — справа выгадная. Добра ідзе рэалізацыя пластыку магілёўскім перапрацоўшчыкам. Яны гатовы браць яшчэ больш сыравіны.

— Мы бачым, што патрэба ёсць, і нашы лініі справяцца з большай нагрузкай. Цяпер справа за камунальнымі службамі і раённымі уладамі, якія павінны прыняць рашэнне аб закрыцці міні-палігонаў, каб усё смецце з тэрыторыі раёна праходзіла праз наш завод, — рэзюмуе Вячаслаў Андрыеўскі.

У аддзеле камунальнай гаспадаркі райвыканкама такая прапанова не выклікала энтузіязму. Каментарый прагучаў даволі лаканічна: «Пакуль пралічваем эканамічны бок». Зразумела, што камунальная гаспадарка не хоча несці страты па адвозцы смецця за некалькі дзясяткаў кіламетраў, калі ёсць паблізу міні-палігон. У рэшце рэшт гэта адаб'ецца і на бюджэце. Да таго ж колькасць смеццявозаў разлічана пад адпаведны маршрут. Калі зараз, напрыклад, машына робіць некалькі рэйсаў, то пры новым раскладзе іх колькасць зменшыцца, што можа пагоршыць чысціню населеных пунктаў. З такімі аргументамі цяжка не пагадзіцца.

Між тым на заводзе прапануюць пачаць гэту работу ў эксперыментальным рэжыме. У першую чаргу задзейнічаць навакольныя сельсаветы. У рэшце рэшт 15 міні-палігонаў, якія існуюць у раёне, рана ці позна давядзецца закрываць. Дык чаму не пачаць зараз?

**Аляксандр АДАМЕНКА, намеснік старшыні Гродзенскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя:**

— У вобласці распрацаваны графік закрыцця міні-палігонаў на тры гады. Гэта значыць, што ў гэты тэрмін усе міні-палігоны вобласці павінны быць выведзены з эксплуатацыі. Згодна з графікам налета ў Гродзенскім раёне павінны быць закрыты пяць міні-палігонаў і праз год — астатнія дзесяць. У цэлым па вобласці сёлета стаіць задача закрыць каля паўсотні аб'ектаў, у наступныя два гады — астатнія 210.

**Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.**

ПРАБЛЕМНАЕ ПЫТАННЕ: З ПОШТЫ «МС»

# ЦІ БУДЗЕ Ў МІНУЛАГА... БУДУЧЫНЯ?

**Наш чытач у сваім звароце пацікавіўся тэмай захавання гістарычнай спадчыны Аршаншчыны. Яго турбуе разбурэнне помнікаў мінулага ў аграгарадку Смальяны. У сваім лісце ён расказаў пра руіны замка «Белы Ковель», рэшткі касцёла і царквы, дадаў і пра магілу сябра Адама Міцкевіча Тамаша Зана. Карэспандэнты «МС» адправіліся ў населены пункт, каб на месцы высветліць сітуацыю.**

## Спадчына ў руінах

Яшчэ да пачатку камандзіроўкі быў атрыманы пісьмовы адказ з упраўлення культуры Віцебскага аблвыканкама, у якім паведамлялася, што ў аграгарадку (з насельніцтвам каля тысячы чалавек. — **Аўт.**) ёсць чатыры аб'екты, якія з'яўляюцца гісторыка-культурнай каштоўнасцю.

«Тры з іх знаходзяцца ў нездавальняючым зруйнаваным стане: руіны замка «Белы Ковель» (першая траціна XVII стагоддзя), рэшткі былога даміканскага касцёла (другая палова XVIII стагоддзя), Аляксееўская царква (1864 год)», — канстатуецца за подпісам **начальніка ўпраўлення культуры Пятра ПАДГУРСКАГА.**

У афіцыйным лісце таксама адзначана, што ўласнік аб'ектаў — Смальянскі сельскі выканаўчы камітэт. Яго **старшыня Анатоль КРЫСІКАЎ** у сваю чаргу адзначае, што выканкам — уласнік умоўны.

— Проста аб'екты гістарычнай спадчыны, яны такімі афіцыйна прызнаныя, знаходзяцца на тэрыторыі сельсавета, — кажа ён.

Паводле яго слоў, сёлета ён напісаў ліст у Міністэрства культуры, але ў ведамстве спасylaліся на тое, што мясцовая ўлада сама павінна прымаць нейкія меры па захаванні аб'ектаў.

Старшыня пракаментаваў і словы чытача «МС» наконт таго, што па руінах замка лазяць дзеці. Мясцовыя жыхары і турысты ядуць там, выпіваюць, выдрапваюць розныя надпісы на старажытных сценах і пакідаюць кучы смецця. Ён адзначыў, што сельскі выканкам пастаянна кантралюе, каб было чыста. Перыядычна наводзяць парадак людзі, якія для гэтага наймаюць.

Вакол храмаў не раз нацягвалі стужкі, каб за іх не заходзілі, але марна. На ўстанаўленне агароджы ў выканкама няма грошай. І канешне, няма фінансавых сродкаў, каб правесці работы па кансервацыі.

Разам з Анатолем Крысікавым едзем паглядзець на тое, што засталося.

## Былая веліч

Высветлілася, што да замка, нават руіны якога даюць уяўленне пра тое, які прыгожым ён быў, дабрацца праблематычна. Ён акружаны забалочаным ровам. А па мастку, які, паводле слоў нашага гіда, быў адноўлены гадоў дзесяць таму, без гумавых ботаў не пройдзеш. Бадай, толькі калі спякотна і ўзровень вады становіцца мінімальны. А можа, гэта і добра для збудавання, якое, па адной з версій, зруйнавалі падчас вайны 1812 года. Часткова захавалася галоўная пяціярусная вежа з часткай прылеглай да яе сцяны. Ёсць і рэшткі падмурка па ўсім перыметры замка, падвалы.

Каля праваслаўнага храма ляжыць цэгла, якая абвальваецца з муроў. Унутры не так ужо і шмат смецця. Праўда, кінуліся ў вочы пустыя пластыкавыя бутэлькі. Па словах старшыні сельвыканкама, на ўсёй тэрыторыі




сельсавета каля дваццаці населеных пунктаў. Каб паспець усюды адразу навесці ідэальны парадак і пастаянна падтрымліваць яго, не хапае людзей. З другога боку, не паставіш жа каля кожнага аб'екта гістарычнай спадчыны па міліцыянеру з сабакам? На жаль, ёсць такія грамадзяне, якім усё роўна, дзе выпіць.

***(Заканчэнне на 16-й стар. «МС».)***

# ЦІ БУДЗЕ Ў МІНУЛАГА... БУДУЧЫНЯ?



Рэшткі былога дамініканскага касцёла (другая палова XVIII стагоддзя).

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 15-й стар. «МС».)*

Падчас агляду царквы ўразілі дэкаратыўныя металічныя элементы над яе ўваходам. Побач з храмам — капліца. Там, унізе, ёсць нішы для пахаванняў. Каб ніхто не турбаваў спакой памерлых, спуск надзейна прыкрылі плітой.

Што датычыцца рэштак каталіцкага храма, нас з калегам здзівіла параўнальна добрая іх захаванасць. І там як могуць падтрымліваюць парадак.

Наступным месцам нашага наведвання стала магіла сябра Міцкевіча Тамаша Зана. Побач пахаваны яго жонка і сын, помнікі на магілах якіх таксама знаходзяцца ў добрым стане. На жаль, не атрымалася прачытаць надпіс на вялікім валуне, які знаходзіцца побач з крыжамі: з часам літары амаль што «сцерліся».

## Ёсць чым здзівіць і што паказаць

Паводле інфармацыі ўпраўлення культуры аблвыканкама, з боку рэлігійных арганізацый і абшчын інтарэсу да былых культавых аб'ектаў няма. Хочацца верыць, што ён некалі ўзнікне.



На сённяшні дзень у аграгарадку можна наведаць толькі адзін храм.

На сённяшні дзень у аграгарадку можна наведаць толькі адзін храм. Дзіўна, але факт: у аўторак раніцай, калі мы зайшлі, ён быў адчынены!

Прыхаджанка Людміла Корнева, якая сочыць за чысцінёй у царкве, ахвотна расказала гісторыю храма. У 1792 годзе тут пабудавалі драўляную Спаса-Праабражэнскую царкву. Яна адзначае, што тут службы ішлі нават падчас актывізацыі барацьбы з рэлігіяй. Пры гэтым, як высветлілі мясцовыя краязнаўцы, у канцы 1930-х гадоў царква была закрыта. У яе будынку доўгі час размяшчаўся вінзавод.

Сёння храм дзейнічае і будынак з'яўляецца помнікам рэспубліканскага значэння.

Жанчына расказала нам гісторыі пра ўкрадзеную ікону, якую, дзякуючы беларускім мытнікам, удалося вярнуць, пра іконы, якія «плакалі», людзей, якім малітвы дапамаглі вярнуць здароўе. Тут таксама можна ўбачыць выявы дванаццаці апосталаў у поўны рост, зробленыя ў XVIII стагоддзі на купале.

На нашу думку, у аграгарадку столькі цікавага!

Між іншым, па словах старшыні сельвыканкама, ніхто пакуль што на тэрыторыі сельсавета не займаецца аграрным турызмам. А шкада, бо гасцям насамрэч ёсць што паказаць.



Руіны замка «Белы Ковель» (першая траціна XVII стагоддзя).

## Вывучаюць і шануюць

У мясцовай сярэдняй школе юныя вяскоўцы з інтарэсам вывучаюць гісторыю роднага краю. Збіраюць экспанаты мінулага, якія можна ўбачыць у музеі.

Віктар Мяжэвіч, настаўнік беларускай мовы і літаратуры, кіраўнік аб'яднання па інтарэсах «Спадчына», бадай, лепш за ўсіх ведае гісторыю Смальян, храмаў і замка.

— Мястэчка Смальяны заснавана ў 1484 годзе. У 1626 годзе князь Сямён Самуіл Андрэевіч Сангушка-Ковельскі завяршыў узвядзенне тут мураванага замка.

Безумоўна, дата крыху прыблізная, але ў княжацкай закладной, пазначанай гэтым годам, запісана: «...маёнтка майго Смалянаў замка Белага Ковеля, што ляжыць у павеце Аршанскім», — расказаў настаўнік.

Дарэчы, ён успомніў цікавы факт пра замак. У 1847 годзе Смальяны перайшлі ў валоданне да тайнага саветніка сенатара Аляксея Сямёнава. У № 34 «Магілёўскіх губернскіх ведамасцяў» за 1902 год невядомы аўтар паведамляў, што ў 1860 годзе гэты Сямёнаў «...прадаваў сцены замка на злом... не ацалела б і вежа, калі б Смаляны не перайшлі да Цітова. Новы гаспадар не толькі не дазволіў бурыць вежу, але нават паспрабаваў умацаваць яе контрфорсамі».

Наш экскурсавод расказаў, што Смальяны малявалі знакамітыя Юзаф Пешка і Напалеон Орда.

Яшчэ цікавыя факты пра населены пункт: у 1879 годзе ўладальнік мястэчка на ўласныя сродкі адкрыў пачатковае земскае народнае вучылішча на 40 чалавек і прыёмны пакой для хворых з бясплатный выдачай лякарства. Пры пакоі працаваў фельчар.

У пачатку XX стагоддзя ў Смальянах было 265 двароў, 6365 жыхароў.



Рэшткі Аляксееўскай царквы (1864 год).

## Для захавання гісторыі

Паводле інфармацыі Аршанскага райвыканкама, прыняты план сумесных дзеянняў з сельскім выканкамам па ўключэнні ў гаспадарчы абарот аб'ектаў спадчыны.

Сярод іншага ў рабоце пытанне аднаўлення моста да руін замка.

Акрамя гэтага, пры распрацоўцы праекта бюджэту на будучы год будзе разгледжана магчымасць вылучэння неабходных сродкаў на кансервацыю і добраўпарадкаванне руін замка «Белы Ковель», рэштаў былога дамініканскага касцёла і Аляксееўскай царквы.

Зразумела, што лішніх грошай у бюджэце няма. Але, як вядома, Год малой радзімы падоўжаны яшчэ на два гады. Пры жаданні можна нешта зрабіць. Напрыклад, правесці суботнік, прапанаваўшы папрацаваць тут усім, хто цікавіцца гісторыяй роднага краю.

Ці трэба агароджваць рэшткі архітэктурнай спадчыны, як гэта прапанаваў наш чытач? Напэўна, пытанне спрэчнае. Калі некультурным людзям захочацца выпіць у былых храмах, каля замка, ці спыніць іх агароджа? А выхаваны чалавек з цікавасцю зойдзе ўнутр, каб паглядзець, верніке — памаліцца. Вядома, калі храм асвячоны, ён існуе, нават калі сцен няма.

Калі ўжо ставіць агароджу, то трэба рабіць гэта, лічу, перад тым як распачаць кансервацыю, а можа, і аднаўленне.

Аршаншчына цяпер у цэнтры ўвагі. І шчыра хочацца верыць, што ў імкненні зрабіць сучаснае лепшым: мадэрнізаваць абсталяванне прадпрыемстваў, палепшыць медыцынскую, сацыяльную, фізкультурна-аздараўленчую інфраструктуры і іншае, не забудуцца і пра багатае мінулае.




**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
**Фота Віктара НІКАЛАЕВА.**

**МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ**

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**
**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А. А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В. М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А. Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В. В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т. Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М. Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 292 44 12;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.008.** **Нумар падпісаны ў 19.30 1 лістапада 2018 года.**